ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 20 (940) 15 — 21 мая 2010 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

ПЕРСПЕКТЫВЫ — У РЭТРАСПЕКТЫВЕ!

С. 3

С. 6



С. 15



С. 13

С. 3

18 мая — Міжнародны дзень музеяў

Першы камень будучага храма

Гэты тыдзень стаўся запамінальным жыхарам горада Турава дзвюма падзеямі.

Як распавёў “К” загадчык кансісторыі Тураўскай епархіі Васіль Чарнякоў, будаўніцтва храма ў старажытным палескім горадзе ў лістападзе мінулага года асабіста блаславіў Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл. На дадзены момант распрацавана ўся праектна-каштарысная дакументацыя, завяршаюцца падрыхтоўчыя работы на месцы будучай культавай пабудовы. Аднакупальны храм будзе пабудаваны ў візантыйскім стылі і распісаны па фасадзе ў нішах сабора.

У час цырымоніі закладкі храма.

Першая з іх — знакавая для ўсёй паствы Беларускай Праваслаўнай Царквы. 11 мая, у Дзень памяці свяціцеля Кірылы Тураўскага, Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі быў урачыста закладзены камень у фундамент будучага кафедральнага сабора ў гонар свяціцеляў Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх у горадзе Тураве.

“Мы перажываем той дабрадатны час, калі будуюцца храмы”, — адзначыў Уладыка Філарэт у сваім слове да шматлікіх удзельнікаў набажэнства. На думку прадстаяцеля Беларускай Праваслаўнай Царквы, закладка кафедральнага сабора ў Тураве, дзе доўгі час не ўзводзіліся храмы, — гістарычнае свяшчэннадзейства, якое здзяйсняецца архіпастырамі Беларускай Праваслаўнай Царквы. Мітрапаліт узнёс малітву, каб яно паслужыла ўмацаванню веры ў Бога, любові да сваёй роднай зямлі і “ўмудрыла будаваць жыццё па запаветах Гасподніх”.

Другая навіна, безумоўна, парадуе як жыхароў Турава, так і ўсяго Палесся. Сёння, 15 мая, пачне дзейнічаць водны маршрут па Прыпяці паміж Туравам і Мазыром. У шлях выправіцца цеплаход на падводных крылах “Палессе-05” умяшчальнасцю да 50 пасажыраў.

Гэты маршрут не дзейнічаў цягам больш чым дваццаць гадоў. Рачныя вандроўкі, як спадзяецца кіраўніцтва Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства водных шляхоў “Ніжне-Прыпяцкае”, могуць зацікавіць турыстаў, і, магчыма, ужо летам перавозка пасажыраў будзе ўзноўлена ад Мазыра і Турава да Століна і Пінска Брэсцкай вобласці.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БелТА

Пад “Покрывам міру”

Першы сакратар Пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Херарда Эстрада Марцінес, наведаўшы 11 мая Гродна, выказаў зацікаўленасць на сустрэчы з мэрам абласнога цэнтра Барысам Казелкавым ва ўдзеле венесуэльскай дэлегацыі ў VIII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур.

Ён прапанаваў правесці ў Гродне Дні культуры Венесуэлы і іншых лацінаамерыканскіх краін у рамках святкавання 200-годдзя абвяшчэння незалежнасці Венесуэлы. У сталіцы фестывалю будуць ладзіцца мастацкія выстаўкі, канцэрты венесуэльскіх калектываў, мерапрыемствы ў сферы адукацыі…

А Гродна, між тым, рыхтуецца да VIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Як распавяла “К” дырэктар Гродзенскага гарадскога метадычнага цэнтра народнай творчасці Валянціна Цыганец, доўжыцца рэалізацыя праекта “Покрыў міру”, пра які наша газета пісала ўжо. Нагадаем, што гэтая задума — новая фестывальная “фішка”: сімвалічнае палотнішча сшываецца з кавалкаў-“блокаў”, што дасылаюцца ў Гродна з усёй Беларусі. Валянціна Цыганец паведамляе, што пры ГМЦНТ створана рабочая група, якая апрацоўвае і сшывае “блокі” ў адно цэлае. Гатова ўжо 20 квадратных метраў.

На палотнішчы — адлюстраванні фестывальнай атрыбутыкі: сяміколер, выява дзяўчыны-гараднічанкі, бясконцая мазаіка з аўтарскіх твораў (вышыўка, вязанне, ткацтва…), дасланых з Мінска, Віцебска, Магілёва, Стоўбцаў, Паставаў, Навагрудка, Слоніма, Мастоў. Гараджане ўжо назвалі гэтае палотнішча “кавалкам мірнай Радзімы”. “Покрыў міру” (тэрмін дасылання ягоных фрагментаў прадоўжаны да 20 мая) пранясуць па гродзенскіх вуліцах пад час адкрыцця VIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

А.С.

Шапэн у Нясвіжы

Заслужаны калектыў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, Ганаровага грамадзяніна Нясвіжа, прафесара Міхаіла Фінберга 13 — 14 мая правёў XV Свята мастацтваў “Музы Нясвіжа-2010”.

Да 15-годдзя музычна-гістарычнага праекта Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі прымеркавана правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі “Далягляды беларускага музыказнаўства” (кіраўнік — доктар мастацтвазнаўства, прафесар В.Дадзіёмава), прэзентацыя кнігі “Музычныя скарбы беларускай зямлі”, IV Музычная асамблея (гэтым разам — харавога мастацтва) з удзелам камерных калектываў Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі.

У гэтым годзе калектыў аркестра акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў XV Свята мастацтваў “Музы Нясвіжа-2010” на такіх знамянальных датах, як 100-годдзе вядомага беларускага кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Пятра Падкавырава і 200-годдзе польскага кампазітара і геніяльнага піяніста Фрыдэрыка Шапэна. Прэм’ерныя канцэртныя праграмы аркестра “Майстры беларускага музычнага мастацтва. Пётр Падкавыраў” і “Нясвіж у цэнтры музычнай Еўропы: памяці Ф.Шапэна” аб’ядноўваюць значныя рэспубліканскія акцыі Міністэрства культуры краіны — “Беларусь — гэта мы!” і “Год Шапэна ў Беларусі”, садзейнічаюць папулярызацыі нацыянальнай культуры ў еўрапейскім кантэксце.

Завяршылася юбілейнае свята яскравым гала-канцэртам “Спяваем разам!” з удзелам лаўрэатаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, артыстаў аркестра.

— 15-ы па ліку фестываль, — пацвердзіла доктар мастацтвазнаўства, прафесар Вольга Дадзіёмава, нязменная вядучая гэтага і іншых падобных фестываляў камернай музыкі, якая, да таго ж, распрацоўвае іх навуковыя канцэпцыі, — гэта яшчэ, вядома, не юбілей, але некаторыя вынікі ўжо відавочныя. Па-першае, штогадовае правядзенне гэтага свята дало магчымасць рэканструяваць увесь шлях развіцця беларускага мастацтва ў розных яго праявах. Падругое, Нясвіж даў імпульс іншым малым гарадам Беларусі, і цяпер такія святы ладзяцца па ўсёй краіне, далучаючы да класічных вяршыняў нацыянальнай спадчыны самыя шырокія колы насельніцтва, найперш — у рэгіёнах. Гэты фестываль пацвердзіў арганічнае адзінства навукі з мастацкай практыкай. Да таго ж, у самой навуцы з’ядналіся гісторыя, тэорыя і, шырэй, культуралогія. Бо Нясвіж збірае не проста музыкаў, а саміх муз, яднаючы розныя віды мастацтваў.

Дадам, што ініцыятарам усіх гэтых ідэй, вельмі перспектыўных для далейшага ўвасаблення, стаў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі на чале з нястомным “вечным рухавіком” маэстра Фінбергам. Гэты калектыў, дарэчы, першым у нашай краіне адзначае 100-годдзе з дня нараджэння беларускага кампазітара Пятра Падкавырава. І тым самым дае магчымасць па-новаму ацаніць яго творчасць, якую часам не маглі зразумець яго сучаснікі.

І слухала Вена…

Класіка еўракласа!

Май — самы, бадай, “еўрабачанны” час. Учора позна ўвечары сямёра маладых акадэмічных выканаўцаў, выступіўшы ў суправаджэнні Венскага сімфанічнага аркестра на плошчы перад ратушай аўстрыйскай сталіцы, завяршылі Міжнародны конкурс маладых музыкантаў “Еўрабачанне” і, адначасова, адкрылі Венскі музычны фестываль. “Пятым” у складзе “цудоўнай сямёркі” выступіў наш Іван Карызна, за якога, зразумела, мы ўсе хварэлі цягам адборачных тураў і паўфінала. Калі гэты нумар газеты здаваўся ў друк, вынікі фіналу творчага спаборніцтва яшчэ не былі вядомыя.

А ўжо праз дзесяць дзён яшчэ адна наша “еўракаманда” выступіць у паўфінале песеннага “дарослага” “Еўрабачання”.

“Класічнае” Еўрабачанне праходзіць раз на два гады. У параўнанні з песенным еўраспаборніцтвам, трапіць у фінал класічнага — куды больш складана, бо за плячыма павінна быць не адзіная “хітовая” песенька, а гады прафесійнай падрыхтоўкі, распачатай яшчэ з дзяцінства. На паўфінале, які адбыўся 8 — 9 мая, Ваня граў і беларускую музыку, дзівосна ўпісаную ў еўрапейскую культурную прастору. Выкананы ім цыкл Галіны Гарэлавай “Два пано Анры Мацiса” не толькі ўвасабляе ў гуках знакамітыя палотны французскага імпрэсіяніста, на якіх самі фарбы заварожваюць песенна-танцавальнай рытмікай, — гэты твор быццам ператварае класічную віяланчэль у старадаўнюю беларускую басэтлю,

шукаючы прыродна-архаічныя першавытокі музычнай энергетыкі. Чым не партрэт маладой Беларусі з багатай культурнай “радаслоўнай”?

Ну, а які “партрэт” атрымаецца ў нашай групы “3+2” у Нарвегіі, убачым 25 мая. У гэты вечар на сцэне стадыёна “Тэленор Арэна”, што непадалёк ад Осла, пройдзе першы паўфінал, у якім выступяць прадстаўнікі нашай краіны. Іх першая рэпетыцыя на гэтай пляцоўцы — ужо ў панядзелак. Пажадаем ім поспеху!

Н.Б.

“Лялечны дом”

З 24 па 30 мая ў Мінску пройдзе Міжнародны фестываль тэатраў лялек, шосты па ліку, які збярэ творчыя калектывы з васьмі краін свету.

Фестывальная афіша дасць магчымасць пазнаёміцца з тым, чым жывуць сёння літаральна ўсе айчынныя лялечныя калектывы: у гэтым годзе ніводзін лялечны тэатр краіны не застанецца па-за ўвагай. Беларускае мастацтва прадставяць пастаноўкі Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, абласных лялечных труп.

Міжнародную праграму фестывалю складуць наступныя спектаклі: “Фасад” Беластоцкага тэатра лялек і Duda Paiva Puppetry & Dance (Беласток, Польшча), “Папялушка. Урыўкі з яе дзённіка” ды “Дзюймовачка” “Міні-тэатра” (Любляна, Славенія), “Яўгеній Анегін” Кемераўскага тэатра лялек (Кемерава, Расія), “Гульня ў чатыры рукі” Чамадан-дуэта “КВАМ” (Санкт-Пецярбург, Расія), “Хітрая ліска і дурны воўк” Латвійскага тэатра лялек (Рыга, Латвія), “Спячая прыгажуня” “Тэатра ў чамадане” (Талін, Эстонія), “Антыгона” Палтаўскага дзяржаўнага тэатра лялек (Палтава, Украіна), “Жанчына-варона” тэатра “Агора” (Сент Віт, Бельгія), а таксама “Лялечны балаганчык “Дон Жуан у Венецыі” Архангельскага тэатра лялек (Расія).

Акрамя галоўнага фестывальнага “дому” — сталічнага тэатра лялек, — паказы адбудуцца і на іншых тэатральных пляцоўках сталіцы.

Меч з Грунвальда

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне памятныя манеты “Грунвальдская бітва. 600 год”: залатыя — наміналамі 20 і 50 рублёў, сярэбраную — наміналам 20 рублёў і медна-нікелевую — наміналам 1 рубель.

Манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — выступаючы кант па акружнасці. Бакавая паверхня манет — рыфлёная.

На пярэднім баку залатой манеты наміналам 50 рублёў, сярэбранай і медна-нікелевай манет размешчаны: уверсе — рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь; у цэнтры — стылізаваны відарыс мяча, які па абрысе нагадвае чалавека: на залатой манеце — на фоне патрэсканай зямлі, на сярэбранай і медна-нікелевай манетах — на фоне кальчугі; па крузе — надпісы: у верхняй частцы — “Рэспубліка Беларусь”, у ніжняй — наміналы, проба сплаву і год выпуску.

На адваротным баку гэтых манет размешчана стылізаваная пячатка ў выглядзе адбітка вялікага пальца, у структуры якога бачны надпісы: “Грунвальдская бітва” і дата бітвы — “15.07.1410”.

На пярэднім баку залатой манеты наміналам 20 рублёў размешчаны: уверсе — рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь; у цэнтры ў абрамленні вянка з дубовых лістоў — выявы двух гатычных мячоў; надпісы: у верхняй частцы па крузе — “Рэспубліка Беларусь”, у ніжняй — намінал, год выпуску манеты і проба сплаву.

На адваротным баку гэтай манеты размешчаны: у цэнтральнай частцы — выява чашы, увянчанай дубовымі лістамі, — як умяшчальні пакуты ад перажытай вайны — і дзесяць крыжападобных пірамідальных выступаў; па крузе — надпісы: у верхняй частцы — “Грунвальдская бітва”, у ніжняй — “600 год”.

Паводле паведамлення ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

Часопіс “Мастацтва” прапануе

Майстар-клас для абітурыента



Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў была і застаецца галоўнай установай навучання мастацтву ў нашай краіне. Спектр спецыяльных дысцыплін пастаянна расце, як і колькасць ахвотных паступіць у гэтую ВНУ. Адной з прычын у выпадку няўдачы можа аказацца няведанне патрабаванняў да творчых работ на ўступных іспытах.

Для будучых абітурыентаў часопіс “Мастацтва” пачынае друкаваць парады выкладчыкаў і загадчыкаў кафедраў Акадэміі мастацтваў, у якіх яны фармулююць асноўныя патрабаванні да работ на ўступных экзаменах. У № 5 часопіса “Мастацтва” загадчык кафедры жывапісу Май Данцыг ацэньвае работы, зробленыя алеем (эцюд галавы і станковая фігуратыўная кампазіцыя), а загадчык кафедры малюнка Уладзімір Тоўсцік — алоўкавыя партрэт і аголеную натуру. У № 6 часопіса “Мастацтва” будуць разгледжаны патрабаванні да ўступных работ абітурыентаў, што паступаюць на факультэт дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Таму, патэнцыйныя абітурыенты Акадэміі, спяшайцеся падпісацца на часопіс “Мастацтва”!

Пытанне пра стварэнне Музея гісторыі Мінска ўзнімалася шырокай грамадскасцю яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя, калі праходзілі маштабныя раскопкі Нямігі ў сувязі з будаўніцтвам метрапалітэна. Аднак спатрэбілася некалькі дзесяцігоддзяў, каб ідэя нарэшце ператварылася ў рэальнасць. І першым крокам да гэтага стала ўрачыстае адкрыццё на мінулым тыдні экспазіцыі Галерэі твораў Героя Беларусі, народнага мастака СССР і Беларусі Міхаіла Савіцкага “Мастак. Грамадзянін. Герой”.

Музей для Мінска

Напярэдадні Міжнароднага дня музеяў карэспандэнт “К” вырашыў даведацца, чым жыве самы малады музей краіны, непасрэдна ў яго дырэктара Галіны ЛАДЗІСАВАЙ. І найперш — высветліць, чаму першы экспазіцыйны аб’ект музея звязаны менавіта з мастацтвам.

— Адкрыццё ў Музеі гісторыі Мінска галерэі М.Савіцкага — заканамернае. Справа ў тым, што мастак на сваіх палотнах адлюстраваў пэўныя гістарычныя вехі XX стагоддзя, у тым ліку і ў жыцці сталіцы. Міхаіл Андрэевіч — Ганаровы грамадзянін Мінска, з 1950-х гадоў плённа працуе тут і з’яўляецца адным з ініцыятараў і нязменных кіраўнікоў Творчых акадэмічных майстэрняў жывапісу, графікі і скульптуры Міністэрства культуры нашай краіны. Работы іх выпускнікоў таксама на часовай выстаўцы.

Экспазіцыя ж твораў М.Савіцкага складаецца з шасці залаў, першая з якіх знаёміць з палотнамі, напісанымі на пачатку творчай дзейнасці аўтара. Працягваюць выстаўку залы, дзе дэманструюцца работы цыкла “Лічбы на сэрцы”. Нельга не прыгадаць, што ў экспазіцыю ўвайшлі дзесяць твораў цыкла “Чорная быль”, перададзеных мастаком у дар Мінску. Чатырнаццаць карцін, створаных у 1970-я — 1980-я гг., дэманструюць спадчыну жывапісца з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея краіны. У нас прадстаўлена і фотахроніка, якая распавядае пра значныя падзеі ў творчым жыцці М.Савіцкага.

Галіна Ладзісава.

— І ўсё ж для паказу жыцця і работ знакамітага творцы трохі не хапае прасторы...

— Першапачаткова планавалася размясціць галерэю М.Савіцкага ў будынку на плошчы Свабоды — больш прыдатным для падобных экспазіцый. Але пакуль цягам двух гадоў там будзе праходзіць рэстаўрацыя, прынята рашэнне выставіць работы славутага мастака ў экспазіцыйных залах будынка, дзе цяпер размяшчаецца адміністрацыя музея. У выніку ўсяго за некалькі месяцаў падрыхтавана сённяшняя экспазіцыя. Цяпер мы паралельна працуем над архітэктурным праектам будынка, дзе на пастаяннай аснове і ў адпаведнасці з усімі тэхналагічнымі патрабаваннямі будуць захоўвацца карціны мастака, а таксама над стварэннем новай, больш поўнай экспазіцыі, дзе будзе прадстаўлена, у тым ліку, партызанская, хрысціянская тэматыка работ Савіцкага. Акрамя гэтага, патрэбна вырашыць шэраг пытанняў адносна атрымання на кароткачасовы дэпазіт некаторых знакамітых палотнаў мастака, якія захоўваюцца ў Трацякоўскай галерэі, фондзе Саюза мастакоў Расіі. Трэба яшчэ ўлічваць, што рабочая група па стварэнні музея — гэта ўсяго тры чалавекі. Сёлета мы можам разлічваць на штат ужо ў шэсць навуковых супрацоўнікаў і аднаго рэстаўратара — між іншым, выпускніка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

— Пакуль не ўсе аб’екты музея даступныя для наведвання турыстамі і жыхарамі сталіцы, у тым ліку старажытнае Мінскае замчышча. Можа, варта стварыць на дадзеным этапе музей у інтэрнэт-прасторы?

— Сапраўды, праца ў гэтым накірунку ўжо распачата: знойдзена арганізацыя, якая зоймецца стварэннем сайта, дзе, сярод іншага, прадугледжана віртуальная прэзентацыя аб’ектаў. І дзейнасць гэтая мяркуецца як паралельная з апрацоўкай фондаў. Тым больш, для віртуальнай прэзентацыі неабходна падрыхтаваць навуковыя рэканструкцыі асобных страчаных частак музейных экспанатаў.

— Музей у наш час усё часцей выходзіць за межы будынкаў. Ці разглядаюцца варыянты ўсталявання ў цэнтры сталіцы інфакіёскаў з інфармацыяй пра гісторыю горада?

— Гэта, безумоўна, добрая ідэя, у тым ліку для папулярызацыі музея сярод турыстаў. І пэўныя задумкі ў нас ужо ёсць. У гэтым накірунку будзем вельмі цесна працаваць з Інфармацыйна-турыстычным цэнтрам “Мінск”, які таксама знаходзіцца ў структуры Мінгарвыканкама. Сумесна мы зможам ствараць такія праграмы як у электронным, так і ў друкаваным фармаце. Таксама запланавана распрацоўка музейна-педагагічных заняткаў, разлічаных на розныя ўзроставыя групы, з улікам пешаходных экскурсій па гістарычным цэнтры горада.

Да таго ж, наш цэнтральны будынак мае два ўнутраныя дворыкі, што дазволіць выкарыстоўваць іх для правядзення прэзентацый, вечарын, канцэртаў з удзелам сталічных музычных і мастацкіх школ, вучылішчаў.

— Некалькі будынкаў музея, раскіданых па ўсім горадзе... Наколькі гэта станоўчы фактар для дзейнасці ўстановы?

— Мы імкнёмся адлюстраваць цэласную гісторыю горада, а таму будаваць нейкі адзін штучны аб’ект немэтазгодна — больш карысна размяшчаць экспазіцыі ў месцах, гістарычна абумоўленых. Да таго ж, карты, інфакіёскі, разнастайныя буклеты будуць дапамагаць знайсці турысту ўсе аб’екты музея. А каб паказаць, напрыклад, культурнае жыццё і побыт гарадской інтэлігенцыі XIX — пачатку XX стст. ці можна знайсці сядзібу лепш за тую, што знаходзіцца ў Лошыцы? Гэта ж можна сказаць і пра Верхні горад.

— Ці магчыма задзейнічаць іншыя аб’екты — той жа Парк камянёў, што ва Уруччы, — у працэсе функцыянавання Музея гісторыі Мінска?

— У пэўнай перспектыве гэтага нельга выключаць. Цяпер адміністрацыяй Першамайскага раёна распрацоўваецца архітэктурны праект афармлення тэрыторыі парку. Магчыма, гэта будзе парк-музей. Структурна ён можа ўваходзіць у склад музея, мець статус філіяла.

Нам хацелася б, каб у музеі абавязкова быў і палеанталагічны аддзел. Думаецца, жыхарам і гасцям горада будзе цікава ўбачыць на свае вочы косткі мамантаў, іншых жывёл, што калісь жылі на тэрыторыі, дзе праз вякі нарадзіўся Мінск.

Кастусь АНТАНОВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

У адной з залаў экспазіцыі Галерэі твораў Міхаіла Савіцкага.

Традыцыя — здзіўляць

Міжнародны дзень музеяў 18 мая і акцыю “Ноч музеяў-2010”, што адбудзецца сёння, беларускія ўстановы-скарбніцы чакаюць як нагоду для эксперыментаў, калі можна звярнуцца да гледачоў з нечаканымі праектамі. Сталічныя, шэраг абласных музеяў ужо не першы год спаборнічаюць, каб прывабіць новую аўдыторыю, а раённыя спрабуюць сябе ў такіх прома-мерапрыемствах.

Сёлета дэвіз Міжнароднага дня гучыць наступным чынам: “Музеі для сацыяльнай гармоніі”. Да яе імкнуцца 149 дзяржаўных музеяў і 60 іх філіялаў, 15 прыватных устаноў. Менавіта столькі іх існуе сёння ў Беларусі, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры намеснік міністра культуры краіны Тадэуш Стружэцкі. “Больш за 2000 музеяў з 40 краін свету адзначаюць гэтае свята, — дадала галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Святлана Гаўрылава. — І калі некалькі гадоў таму музеі некаторых нашых абласных цэнтраў упершыню далучаліся да гэтай справы, дык сёння ў кожным з іх і нават у некаторых раённых вырашылі падтрыхтаваць спецыяльную праграму: у межах акцыі будзе дэманстравацца адзін экспанат са сховішчаў, які раней ніколі не выстаўляўся. У Беларусі — 4 мільёны музейных экспанатаў, а наведвальнікі могуць назіраць пастаянна толькі каля 10% з іх. І на гэтым свяце мы ўпершыню ўбачым самыя каштоўныя”.

Авангард і старадаўняе

Не здзіўляйцеся вялізнай чарзе, калі падыдзеце да Нацыянальнага мастацкага. Аматараў чакаюць літаграфіі Марка Шагала і творчасць яго калег з Еўропы. На адкрыццё выстаўкі “Марк Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда” запрошаны, у прыватнасці, міністр культуры Беларусі Павел Латушка і міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў. Адбудзецца і прэзентацыя кнігі Уладзіміра Шчаснага “Мастакі Парыжскай школы з Беларусі”. Сваю карціну “Віцебскія мроі аб Парыжы” прадставіць дырэктар музея Уладзімір Пракапцоў. Наведвальнікі залаў НММ займеюць таксама магчымасць папрысутнічаць на вернісажы “Мая Францыя” мастачкі Ілоны Касабука. А ўжо апоўначы прыхільнікі культуры гэтай еўрапейскай краіны змогуць назіраць тэатральна-мастацкую дзею “Французскі салон” пад гукі чароўнай музыкі.

А вось Нацыянальны гістарычны адзначае хуткае 600-годдзе Грунвальдскай бітвы спецыяльна прымеркаванай да даты выстаўкай. Палотны сучасных творцаў на гэтую тэму пабачаць сёння жыхары і госці горада. Тут святкаванне Ночы музеяў не абмяжуецца толькі заламі, але і выйдзе, як у мінулым годзе, ва ўнутраны дворык музея. Прэзентацыя лепшых мадэлей з фестывалю “Млын моды-2010”, старадаўняя музыка ў выкананні гуртоў “Хорціца”, “Эйрут”, “Тутэйшая шляхта”, інтэрактыўная праграма з удзелам гледачоў — гэта толькі пачатак свята. Дарэчы, установа святкуе Дзень музеяў адной з першых на Беларусі і мае ўжо пэўны досвед, чым прывабіць наведвальнікаў. “Разыначка” музея сёння — вялікі танцавальны марафон з майстар-класамі па старадаўніх і сучасных замежных танцах.

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ладзіць свята ў Цэнтры экалагічнага турызму “Станькава” на музейных пляцоўках “Старая мяжа” і “Партызанскі лагер”, што ў Дзяржынскім раёне. Тут можна паглядзець выстаўку ваеннай тэхнікі, пакаштаваць “салдацкай” кашы і паслухаць выступленні этнаграфічных калектываў. А каля будынка музея на Кастрычніцкай плошчы адбудзецца канцэрт “Спяваюць хлапчукі” з удзелам дзіцячых хароў сталіцы.

Прыйсці і запомніць

Непаўторнасць — галоўны прынцып святаў музеяў у абласных цэнрах. Гомель апынецца ў атмасферы сучаснай моды. Пры падтрымцы аблвыканкама і Урада Масквы 19 мая ў цэнтральнай частцы Палаца Румянцавых і Паскевічаў адбудзецца выстаўка расійскага мадэльера Валянціна Юдашкіна “Таямніцы высокай моды”. Гамяльчане змогуць пабачыць некалькі калекцый “ад куцюр”, якія паказвалі ў Парыжы, Лондане, Маскве. Гледачы атрымаюць кансультацыі мастакоў-мадэльераў Беларусі. Аздобіць паказ шоу-праграма з удзелам артыстаў айчыннай эстрады.

Галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч паведамляе, што святочныя мерапрыемствы рыхтуюць Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей і Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігій. 16 мая першая ўстанова адзначыць адразу і Дзень, і Ноч музеяў. Выступленні рыцарскіх клубаў, фаер-шоу, экскурсіі па знакамітых мясцінах Гродна, шматлікія выстаўкі, прадстаўленні, конкурсы, выступленні мясцовых калектываў пройдуць на шэрагу пляцовак горада.

Брэстчына сустрэне Дзень музеяў упершыню акурат 18 мая. “Мы хочам, каб гэты дзень людзі запомнілі як свята, — кажа загадчык сядзібы “Выратаваныя музейныя каштоўнасці”, філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, Ірына Тарыма. — Наша ўстанова прапануе адпачыць ад мітуслівага рытму гарадскога жыцця і правесці спакойны душэўны вечар. Адбудзецца вернісаж нацюрмортаў “Старая сядзіба”; прыз чакае госця, які вызначыць, што за экспанат выстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі ўпершыню. Студэнты і выкладчыкі Брэсцкага музычнага каледжа аздобяць вечар музыкай у сваім выкананні”.

Ад Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея і да яго філіяла — Музея этнаграфіі — цягам Ночы музеяў можна будзе праехацца… на кані, апранутым у сярэдневечны рыштунак. Тры рыцарскія клубы горада пакажуць сваё каларытнае прадстаўленне. А “візітоўкай” тут стануць выступленні мясцовых фальклорных калектываў. Гулянні на плошчы перад Абласным мастацкім музеем імя П.Масленікава працягнуцца да 23 гадзін. Пра гэта распавёў галоўны спецыяліст упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Ліпскі.

На Віцебшчыне свята адзначаюць ажно 6 музеяў. Галоўныя падзеі сканцэнтраваны з 18 па 21 мая ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку. Усе ахвотныя могуць запісацца на экскурсіі “Памятныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны на карце Полацка”. У Мастацкай галерэі адбудзецца выстаўка ваеннай фатаграфіі 1943 — 1945 гадоў. А ў Дзіцячым музеі 20 мая — новая паслуга: турнір па камп’ютэрнай гульні-стратэгіі “Аперацыя “Баграціён”.

Музей і Свята горада

У Вілейцы “Ноч музеяў-2010” будзе адной з самых шматлюдных. Арганізаваць падзею вырашыў дырэктар краязнаўчага музея Сяргей Ганчар. Улады горада вырашылі адзначыць таксама і 550-годдзе з дня заснавання Вілейкі. Гэтыя нагоды супалі таксама з 70-годдзем Вілейскага радыё, якое далучылася да арганізацыі, а пасля ў маштабных мерапрыемствах 15 мая прымуць удзел усе работнікі культуры горада. Касцюміраванае тэатральнае шоу “Вілейка ад усходу да роскві́ту”, шоу байкераў, фаер-шоу, уручэнне музычнай прэміі ад мясцовага радыё, канцэрт эстрадных спеваў — такі калейдаскоп падзей чакае гараджан.

Дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку Мікалай Гайба паведамляе “К”, што да свята ў галерэі адкрываецца выстаўка жывапісу “Дарогамі памяці, дарогамі лёсу”. А найстарэйшы экспанат установы — кніга “Указы Кацярыны II”, выдадзеная ў XVIII стагоддзі, — будзе даступны для гледачоў.

У Ночы музеяў паўдзельнічае і Бабруйскі краязнаўчы музей, які будзе працаваць 14 мая да 22 гадзін. “Падарожжа ў часе” адбудзецца менавіта тут, — адзначае дырэктар установы Наталля Арцемчык. — Гледачы змогуць “пазнаёміцца” з жанчынай з племені дрыгавічоў, паназіраць за жыццём і службай салдатаў у Бабруйскай крэпасці XIX стагоддзя, пабачыць ліцвінскіх рыцараў. Жанчыны змогуць прымерыць язычніцкія ўпрыгожанні. А ў фае музея адкрыецца выстаўка з фондаў установы…”

Алена САБАЛЕЎСКАЯ

Дыскурс у конкурс: дзеля і

Літаральна праз некалькі дзён пасля фіналу Першага Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю” газета “Культура” зыніцыявала “круглы стол”, за якім прадстаўнікі аргкамітэта конкурсу і члены журы падвялі першыя вынікі спаборніцтва, агучылі праблемныя моманты і актуальныя пытанні, што ўзняў конкурс. На старонках “К” Прэс-цэнтр “Зоркі...”, што з кастрычніка мінулага года працаваў на базе РВУ “Культура і мастацтва”, неаднойчы аналізаваў ход як рэгіянальных адбораў, так і ўзровень падрыхтоўкі фіналістаў. Да якіх жа высноў прыйшлі арганізатары і суддзі конкурсу, пачынаючы ўжо сёння падрыхтоўку да наступнага мерапрыемства такога кшталту?

У гутарцы па гэтых пытаннях прынялі ўдзел намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Тадэуш СТРУЖЭЦКІ, намеснік начальніка аддзела навучальных устаноў і працы з творчай моладдзю Міністэрства культуры Анатоль МУКАЛАЎ, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, старшыня журы ў намінацыі “Аўтарская песня” Надзея МІКУЛІЧ, загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук, прафесар, старшыня журы ў намінацыі “Сучасны танец” Святлана ГУТКОЎСКАЯ, прафесар кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, старшыня журы ў намінацыі “Сацыяльная рэклама” Павел ІВАНОЎ, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, заслужаны дзеяч мастацтваў краіны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар, старшыня журы ў намінацыях “Жывапіс і графіка”, “Скульптура”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” Уладзімір ЗІНКЕВІЧ, кіраўнік Рэспубліканскага прэс-цэнтра конкурсу Антон СІДАРЭНКА.

Гутарка за “круглым сталом” газеты сфарміравалася ў некалькі тэматычных блокаў, прысвечаных розным аспектам правядзення маштабнага конкурсу маладых талентаў.

Плюсы і мінусы

Антон СІДАРЭНКА: — Конкурс маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю” стаў значнай падзеяй для сферы культуры нашай краіны. Ужо сёння відавочна, што ён пакінуў след не толькі ў памяці 4200 сваіх удзельнікаў і арганізатараў. Пэўна, вынікі яго больш як маштабныя, а карысная інфармацыя, атрыманая пад час мерапрыемства, будзе апрацоўвацца не адзін тыдзень. Тым не менш, ужо сёння можна казаць аб пэўных высновах, істотных пытаннях, што ўзняў конкурс, праблемах, якія вывеў на першы план...

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ: — Галоўны вынік конкурсу — ён спраўдзіў ускладзеныя на яго надзеі. Спаборніцтва маладых талентаў, якое ўпершыню ў такім маштабе праходзіла на Беларусі, атрымалася цікавым і разнастайным. Безумоўна, яно мае будучыню, бо дазваляе паглядзець на тых маладых творцаў, якія звычайна застаюцца па-за ўвагай шырокай аўдыторыі. Гэта датычыць такіх намінацый, як “Сацыяльная рэклама”, “Рэжысура масавых святаў, тэатралізаваных прадстаўленняў і шоу-праграм”, “Дызайн”. Па дадзеных намінацыях рэспубліканскія конкурсы ў такім маштабе раней не праводзіліся. “Зорка...” была вельмі карыснай для тых, хто не спрабаваў сябе ў сітуацыі творчага спаборніцтва.

Станоўчай адметнасцю конкурсу стаў яго дэмакратычны характар: у ім маглі прыняць удзел як аматары, так і прафесіяналы ў шырокім узроставым дыяпазоне — ад 16 да 31 года. Сведчаннем папулярнасці “Зоркі...” стала вялікая колькасць ахвотных на адборачных турах. Яшчэ адзін “плюс” — конкурс прайшоў паэтапна, закрануўшы ўсе, без выключэння, раёны краіны, потым — абласныя цэнтры і, нарэшце, сталіцу. Такая схема творчых аглядаў выкарыстоўвалася ў часы існавання СССР і мела свой плён. Падобныя спаборніцтвы заклікаюць патэнцыйных удзельнікаў да творчай актыўнасці. На жаль, большасць сучасных рэспубліканскіх конкурсаў не прытрымліваецца гэтага парадку: мясцовыя прадстаўнікі арганізатараў самі праводзяць адбор, у выніку чаго на фінальныя туры ў сталіцу трапляюць далёка не ўсе лепшыя і цікавыя прадстаўнікі. “Зорка ўзышла над Беларуссю” выпраўляе гэтую хібу: на раённым ўзроўні была праведзена шырокая інфармацыйная работа, у выніку якой усе ахвотныя займелі магчымасць паспрабаваць сябе.

Плюсам з’яўляецца і тое, што на абласным узроўні да працы падключылася рэспубліканскае журы, куды пагадзіліся ўвайсці лепшыя прафесіяналы і майстры сваёй справы. Удалося наладзіць іх паўнавартасную працу, выезды на конкурсныя пляцоўкі. Мяркую, сама прысутнасць журы рэспубліканскага ўзроўню на абласных турах вельмі дысцыплінавала ўдзельнікаў, а карысныя парады, своеасаблівыя “майстар-класы” дапамагалі маладым людзям лепш ацэньваць свае магчымасці. Зразумела, ацэнка канкурсанта журы на любым творчым спаборніцтве ўтрымлівае ў сабе элемент суб’ектывізму. Аднак, упэўнены, што на конкурсе “Зорка ўзышла над Беларуссю” верагоднасць гэтага, дзякуючы выдатнай арганізацыі і кампетэнцыі членаў рэспубліканскага журы, сталася мінімальнай.

Антон СІДАРЭНКА: — Ці можна ўжо сёння казаць пра маладыя таленты, адкрытыя пад час конкурсных мерапрыемстваў?

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ: — Безумоўна, упэўнена казаць пра тое было б занадта саманадзейна, але сцвярджаць, што на ім былі створаны надзвычай спрыяльная абставіны для гэтага, — можна. Пераможцы “Зоркі...” маюць усе магчымасці для далейшага развіцця і творчага росту. Няма сумненняў: спаборніцтва займела права на існаванне і абавязкова будзе праводзіцца ў далейшым.

Трэба сказаць, што любы конкурс, у тым ліку наш, — як жывая істота, якая можа значна змяняцца. Відавочна, існуюць пэўныя моманты, у тым ліку і ў Палажэнні аб правядзенні конкурсу, якія падлягаюць карэкціроўцы. Ёсць пытанні, датычныя непасрэдна арганізацыі, напрыклад, тэрміны правядзення. Так, відавочна, гэтым разам не хапіла часу на правядзенне інфармацыйнай і рэкламнай кампаній.

Нарэшце, трэба адзначыць і тое, што поспех нашага конкурсу залежаў і ад настрою, з якім ён праводзіўся непасрэдна на месцах. Калі ў большасці раёнаў “Зорка ўзышла над Беларуссю” стала сапраўднай падзеяй, яркай і запамінальнай, то ў некаторых конкурсныя мерапрыемствы праводзіліся фармальна, без усведамлення сітуацыі, без адчування адказнасці за вынікі. Тое, на жаль, здарылася па некаторых намінацыях і ў сталіцы: выбар сярод удзельнікаў, здавалася, быў вялікі, але надзвычай яркіх сярод іх знайшлося мала. Вядома, ад паведамленняў у сродках масавай інфармацыі шмат што залежала, але ў шэрагу рэгіёнаў неабходна было правесці больш інтэнсіўную працу намаганнямі саміх арганізатараў па папулярызацыі конкурсу сярод патэнцыйных удзельнікаў. Аднак, спадзяюся, гэта ўсё — так званыя “праблемы росту”.

Антон СІДАРЭНКА: — А што да іншых вынікаў?

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ: — Рубам паўстала пытанне рэпертуару ў сцэнічных намінацыях. Высветлілася, што існуе пэўны дэфіцыт новых якасных твораў. Таксама адбілася адсутнасць грунтоўнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў. Найперш гэта датычыць зусім новай намінацыі — “Сацыяльная рэклама”. Падрыхтоўка спецыялістаў па гэтым напрамку творчасці толькі пачалася, таму чакаць вялікай колькасці канкурсантаў і высокага ўзроўню іх работ не даводзілася.

Тадэуш Стружэцкі.

Надзея Мікуліч.

Анатоль Мукалаў.

Галоўны вынік “Зоркі...” — мы атрымалі вялікі масіў матэрыялу для абмеркавання, аналізу, усё неабходнае, каб ісці і развівацца далей. Падставы для далейшага развіцця і росту Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў — ёсць! Спадзяюся, атрыманая ў выніку яго інфармацыя пойдзе на карысць мясцовым аддзелам і ўпраўленням культуры, навучальным установам, усім, хто зацікаўлены ў наступных творчых спаборніцтвах. Упэўнены, многія з сёлетніх канкурсантаў маглі б выступіць нашмат лепш, калі адчувалі б больш мэтанакіраваную падтрымку з боку сваіх землякоў-спецыялістаў.

Інфармацыя — гэта і ёсць поспех

Святлана ГУТКОЎСКАЯ: — Цалкам згодная з тым, што поспех канкурсантаў залежаў, у тым ліку, і ад высілкаў арганізатараў на месцах, ад таго, як праводзілася інфармацыйная работа. Прадстаўнікі некалькіх калектываў потым казалі, што нават не ведалі ўсіх умоў спаборніцтва, таму не прадэманстравалі лепшую частку сваёй праграмы. З апошняй акалічнасцю звязана, напрыклад, тое, што мы амаль не пабачылі харэаграфічных кампазіцый нацыянальнай тэматыкі. Між тым, мэтай любога конкурсу рэспубліканскага ўзроўню з’яўляецца культывацыя айчыннай культуры.

Незразумелым для многіх засталося і тое, што такое разнажанравыя і рознастылёвыя нумары. У выніку “інфармацыйных” недапрацовак шэраг моцных калектываў не трапіў у фінал.

Таму прапаную перад такімі буйнымі мерапрыемствамі праводзіць спецыяльныя выязныя семінары, дзе мясцовым арганізатарам будуць тлумачыць, як найлепшым чынам фарміраваць склад удзельнікаў, іх рэпертуар.

Лічу таксама неабходным унесці некаторыя змяненні ў Палажэнне. Мэтазгодным будзе стварыць асобную харэаграфічную намінацыю “малой формы”, дзе будуць спаборнічаць салісты, дуэты і трыо. Бо ў любым харэаграфічным калектыве ёсць яркія асобы, якіх таксама трэба выяўляць і заахвочваць.

Фігура балетмайстра-пастаноўшчыка вельмі важная ў харэаграфіі. Таму трэба абавязкова праводзіць конкурс і сярод прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Тым больш, узрост канкурсантаў — ад 16 да 31 года — дазваляе шукаць таленты хутчэй сярод пастаноўшчыкаў, чым сярод танцораў, бо апошнія праяўляюць свае здольнасці нашмат раней. На жаль, сёлета прозвішчы балетмайстраў нават не пазначаліся ў праграмках. Як, дарэчы, і аўтарства музыкі, на якую ставіліся кампазіцыі. Гэтую, здавалася б, невялікую акалічнасць мусім абавязкова выправіць наступным разам.

Сярод задач, якія былі заяўлены ў рэгламенце конкурсу, ці не першай стаяла папулярызацыя мастацтва. Таму тое, што аматары выступалі побач з прафесіяналамі, — вельмі добра. Конкурс стаў нагодай ацаніць узровень майстэрства прадстаўнікоў мясцовых навучальных устаноў, заахвоціў выпускнікоў, якія ўжо працуюць, на далейшае развіццё ў прафесіі. Пад час спаборніцтва праведзена і вялікая прафарыентацыйная праца.

Харэаграфічныя калектывы атрымалі магчымасць яшчэ раз зразумець, наколькі вялікую ролю адыгрывае адзінства музыкі, касцюма, макіяжу. Дарэчы, чаму б не прапанаваць наступным разам канкурсантам у намінацыі “Фатаграфія” паспрабаваць сябе ў здымках танцавальных нумароў? Мяркую, гэта было б вельмі ўдалым ходам арганізатараў і добра павысіла б відовішчнасць конкурсных мерапрыемстваў.

Цікавым падаецца і стварэнне своеасаблівых “каманд” з прадстаўнікоў розных намінацый, перад якімі ставіліся б задачы падрыхтоўкі асобных нумароў: малады кампазітар піша музыку, мастак рыхтуе касцюмы, харэограф ставіць танец, фатограф робіць здымкі, рэжысёр манціруе стужку...

Антон СІДАРЭНКА: — Пад час папярэдніх абмеркаванняў часцей за іншыя паўставала пытанне аб узросце ўдзельнікаў. Пагадзіцеся, калі ў 31 год мастак або танцоўшчык — ужо прызнаны майстар, то для прыхільніка аўтарскіх спеваў, напрыклад, гэта толькі пачатак...

Уладзімір ЗІНКЕВІЧ: — Мяркую, у “мастацкіх” намінацыях трэба падзяліць канкурсантаў на дзве ўзроставыя групы: ад 16 да 21 года і ад 21 да 31. У першай могуць спаборнічаць навучэнцы сярэднеспецыяльных устаноў, заданні для іх будуць прыкладна адпавядаць праграме паступлення ў Акадэмію мастацтваў. Што да другой, дык яна будзе прызначана для прафесіяналаў з вышэйшай адукацыяй — тых самых маладых выкладчыкаў, якія скончылі Акадэмію мастацтваў, але павінны займацца далейшым удасканальваннем свайго рамяства.

Самым галоўным вынікам конкурсу лічу магчымасць для маладых творцаў “паспрабаваць” сябе на рэспубліканскім узроўні, мець зносіны з такімі ж, як і яны, пачаткоўцамі з іншых рэгіёнаў. Надзвычай важным тут стала стварэнне спрыяльнага творчага асяроддзя, такога неабходнага для мастакоў з раёнаў. Дзяржава выдаткоўвае на падрыхтоўку мастакоў вялікія грошы, і трэба, каб веды, атрыманыя пад час навучання, не страчваліся. Лічу, менавіта наш конкурс можа стаць стымулам для адраджэння творчага асяроддзя па ўсёй краіне.

Вялікім плюсам стала магчымасць для журы наведваць абласныя адборачныя туры. Тым самым была атрымана карысная інфармацыя аб узроўні падрыхтоўкі, у тым ліку, нашых патэнцыйных абітурыентаў. Цалкам падтрымліваю ідэю папярэдніх кансультацый. Трэба таксама падзя-

высновы і прапановы для...

ліць намінацыю “Жывапіс і графіка”, бо ў нас дастаткова талентаў як у адным, так і ў другім відзе выяўленчага мастацтва, і губляць некага з іх толькі з-за таго, што не хапіла месца, — залішняя раскоша.

Антон СІДАРЭНКА: — Многія адзначалі, што праграма менавіта па “мастацкіх” дысцыплінах была занадта акадэмічнай, нагадвала правілы паступлення ў Акадэмію мастацтваў, што не лепшым чынам адбівалася на відовішчнасці, самім духу спаборніцтва...

Уладзімір ЗІНКЕВІЧ: — А праграма і павінна быць акадэмічнай! Прынамсі, тая яе частка, што тычыцца малодшай узроставай групы, прадстаўнікі якой толькі рыхтуюцца да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Абітурыент павінен выконваць абавязковыя “стандарты”, такія, напрыклад, як рысунак галавы. Малады мастак можа вельмі добра праявіць сябе, ствараючы кампазіцыю, але потым, калі будзе дапушчаны да навучання, сутыкнецца з вялікімі цяжкасцямі — менавіта таму, што не ведае элементарных рэчаў, той самай анатоміі. Таму заданне па стварэнні кампазіцыі, відавочна, трэба пакінуць для старэйшай узроставай групы, а малодшых арыентаваць на тое, што спатрэбіцца пры акадэмічным навучанні. Падзяляць канкурсантаў па ўзросце трэба абавязкова: спаборнічаць з мастакамі з вышэйшай адукацыяй пачаткоўцы не могуць. Таму сярод сёлетніх пераможцаў апошніх амаль што няма.

Што да відовішчнасці, дык выйсце можна знайсці ў цесным супрацоўніцтве з тэлебачаннем. Магчымасцей тут — багата.

Конкурс павінен быць відовішчным

Антон СІДАРЭНКА: — Яшчэ наконт узросту ўдзельнікаў. Пытанні з узроставымі межамі ўзнікалі ў членаў журы розных намінацый. Калі для аднаго віду мастацтва 16 — 31 год — час росквіту, то для іншых гэты ўзрост непаказальны. Можа, варта вызначыць асобныя ўзроставыя межы для кожнай намінацыі?

Надзея МІКУЛІЧ: — Цалкам падтрымліваю. Прыхільнікаў аўтарскай песні відавочна больш сярод тых, каму за трыццаць. А што да інфармацыйнай папярэдняй падрыхтоўкі, дык яна папросту неабходная. Бо ў спаборніцтвах па нашай намінацыі прынялі ўдзел шмат выканаўцаў, якія вельмі слаба ўяўлялі сабе, што такое аўтарская песня наогул. Асобныя маладыя людзі былі нават упэўнены, што маюць права на ўдзел толькі таму, бо самастойна напісалі да песні словы і музыку, а потым самі яе выканалі. На жаль, і дарослыя, тыя, хто адбіраў удзельнікаў, відаць, самі элементарна блытаюць жанры: у прыватнасці, аўтарскую песню — з эстраднымі спевамі.

Сярод моладзі, якая прымала ўдзел у спаборніцтвах, тым больш не аказалася разумення самога паняцця аўтарскай, бардаўскай творчасці. Апошняя патрабуе ад чалавека пэўнага жыццёвага досведу, які прыходзіць толькі з узростам. Можа, наступным разам трэба будзе арганізаваць спаборніцтвы па выканальніцкім майстэрстве, што значна аблегчыць задачу маладым людзям?

Але сам конкурс — вельмі неабходны. Давайце ўзгадаем, з якім поспехам праходзілі колішнія конкурсы артыстаў эстрады, колькі сапраўдных зорак яны адкрылі! І такія патэнцыйныя зоркі ёсць і сёння, іх нават не трэба шукаць, — дастаткова звярнуцца ў тыя самыя клубы аўтарскай песні, што існуюць пры ўстановах культуры. На жаль, іх удзельнікі амаль не звярнулі ўвагі на наша спаборніцтва.

Антон СІДАРЭНКА: — Сярод “праблемных” намінацый трэба назваць і “Сацыяльную рэкламу”, удзел у якой прыняла зусім невялікая колькасць ахвотных. Наколькі разумею, гэта звязана і з тэхнічнымі цяжкасцямі: фактычна, канкурсанты павінны былі прадставіць на абмеркаванне журы гатовы фільм.

Павел ІВАНОЎ: — З вылучэннем у праграму рэспубліканскага конкурсу “экраннай” намінацыі ніякай памылкі не было. Відэатэхніка на сённяшні дзень вельмі даступная, здымаць стужкі, пры вялікім жаданні, можна і на мабільны тэлефон, не кажучы ўжо пра надзвычайную папулярнасць кіна- і тэлеэкрана сярод моладзі. Іншая справа — была зроблена памылка ў вызначэнні самога жанру. Сацыяльная рэклама патрабуе высокага прафесіяналізму, ведаў, добрай адукацыі тых, хто жадае ёй займацца. Значна лягчэйшым і для канкурсантаў, і для ацэньвання журы было б заданне стварыць невялічкі фільм на адпаведную тэму. Менавіта такія, ведамі простыя, тэсты праходзяць студэнты Акадэміі мастацтваў у першыя месяцы свайго навучання. Калі маладзы чалавек можа рэалізаваць свае ідэі праз набор візуальных вобразаў — ён можа стаць рэжысёрам. Падобнае заданне спрыяла б і відовішчнасці спаборніцтваў: фінал у такім выпадку выглядаў бы як паказ стужак фіналістаў.

Што да сёлетняга конкурсу, то, на маю думку, яму бракавала актыўнай рэкламы. Конкурс трэба прапагандаваць больш энергічна, карыстаючыся пры гэтым найноўшымі сродкамі. Тады і эфект ад яго будзе больш выразны.

Хацелася б таксама пашырыць працу рэспубліканскага журы і на раённыя этапы. Мяркую, нават адзін яго прадстаўнік будзе вельмі садзейнічаць таму, каб на абласны ўзровень траплялі найбольш цікавыя ўдзельнікі, тыя самыя “самародкі”, каго мы шукалі гэтым разам.

Святлана ГУТКОЎСКАЯ: — Цалкам падтрымліваю гэтую ініцыятыву! Не абавязкова, каб гэта быў член рэспубліканскага журы, але прафесіянал павінен прысутнічаць ужо на самым пачатку адбораў.

Анатоль МУКАЛАЎ: — Як прадстаўнік арганізатараў магу адразу сказаць, што такая схема будзе выклікаць пэўныя цяжкасці. Нашмат больш эфектыўнай можа стаць арганізацыя дадатковых занальных тураў у кожнай вобласці, дзе і будуць прымаць удзел прадстаўнікі рэспубліканскага журы. Трэба адзначыць, што такія адборы былі праведзены ў некалькіх абласцях ужо гэтым разам і прынеслі відавочную карысць.

Таленты шукаюць у раёнах

Антон СІДАРЭНКА: — Сёння неаднаразова гучала меркаванне аб тым, што прафесійная планка, зададзеная гэтым конкурсам, была вельмі высокая. Але “самародак”, якіх мы і шукалі, ужо па азначэнні не можа быць прафесіяналам, бо не мае належнай адукацыі і вопыту...

Павел ІВАНОЎ: — У выпадку з экранным мастацтвам галоўнымі могуць быць ідэі і “незамыленае вока”. Сваім студэнтам у Акадэміі мастацтваў я заўсёды прыводжу за прыклад аднаго англійскага студэнта, які зняў стужку з удзелам сябра ў якасці акцёра на звычайную аматарскую відэакамеру, даслаў яе ў дырэкцыю Канскага фестывалю і — быў адабраны ў конкурсную праграму кароткаметражных стужак.

Антон СІДАРЭНКА: — Пад час першага этапа конкурсу прадстаўнікі раённых аддзелаў культуры казалі, што знайсці ў сябе маладыя таленты па ўсіх дванаццаці намінацыях было неверагодна цяжка. Магчыма, нізкі ўзровень падрыхтоўкі некаторых канкурсантаў можна растлумачыць гэтымі абставінамі. Тады паўстае пытанне аб неабходнасці раённых тураў. Можа, варта адразу пераходзіць да занальных, аб'яднаўшы ўдзельнікаў з сямі — васьмі раёнаў?

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ: — “Пазбавіцца” ад раённых адбораў было б непрадбачліва, бо менавіта на гэтым узроўні вядзецца асноўная першапачатковая праца з маладымі талентамі ў нашай краіне.

Уладзімір ЗІНКЕВІЧ: — Калі ў ранейшыя часы мастацкімі навучальнымі ўстановамі праводзіўся адбор патэнцыйных абітурыентаў, то камісіі з ліку выкладчыкаў выязджалі менавіта ў раённыя цэнтры, што прыносіла вельмі добрыя вынікі. Таму раённыя этапы трэба абавязкова захаваць.

Пад “зорным небам” маладога мастацтва

Антон СІДАРЭНКА: — Дык ці выканаў першы конкурс маладых талентаў сваё першапачатковае прызначэнне: адшукаць маладых “зорак” мастацтва?

Надзея МІКУЛІЧ: — Можа, і не “зорак”, але “зорачак” мы дакладна знайшлі. Калі мы хочам пабачыць сапраўдных “зорак” на наступным конкурсе, напрыклад, праз тры гады, рыхтавацца да яго трэба ўжо сёння. Найперш — інфармаваць патэнцыйных удзельнікаў і іхніх настаўнікаў аб патрабаваннях да будучых канкурсантаў.

Уладзімір ЗІНКЕВІЧ: — Лічу, нават калі не ўсе патэнцыйныя “зоркі” знойдзены, дык годны “небасхіл” для іх створаны менавіта з дапамогай нашага конкурсу. Знайсці таленты — яшчэ не ўсё: трэба змагацца за іх лёс, стварыць для іх развіцця ўсе неабходныя ўмовы. Апошняе, бадай, важнейшае за выяўленне канкрэтных пераможцаў.

Анатоль МУКАЛАЎ: — У гэтым накірунку Міністэрства культуры робіць усё магчымае. Так, тыя лаўрэаты конкурсу, якія не маюць вышэйшай адукацыі, пры жаданні, будуць мець магчымасць вучыцца ў ВНУ. Прадастаўляць ільготы пры паступленні ў творчыя ВНУ — наша даўняя традыцыя, як і тая, што лаўрэаты разнастайных конкурсаў атрымліваюць дапамогу ад спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Праўда, пры атрыманні льгот на паступленне ўзнікае пытанне, бо ёсць намінацыі, навучанне па якіх не вядзецца. Тое тычыцца, напрыклад, “Аўтарскай песні”...

Святлана ГУТКОЎСКАЯ: — ...І намінацыі “Сучасны танец” — таксама. Бо, калі чалавек перамог з нумарам у стылі брэйк-данс, каб вучыцца па праграме нашай кафедры, ён усё роўна павінен валодаць праграмай харэаграфічнага каледжа.

Вельмі добра, што большасць фіналістаў такім патрабаванням адпавядала. Трэба адзначыць высокі ўзровень падрыхтоўкі харэаграфічных кадраў менавіта ў рэгіянальных навучальных установах. Але хацелася б, каб нашы студэнты мелі яшчэ і магчымасць практыкі ў рэгіёнах, усведамлялі, дзе і ў якіх умовах ім давядзецца потым працаваць. Гэтыя нюансы адкрыліся дзякуючы конкурсу “Зорка ўзышла над Беларуссю”.

Анатоль МУКАЛАЎ: — Што, на ваш погляд, трэба рабіць з назвай намінацыі? Ці трэба яе скарэкціраваць?

Святлана ГУТКОЎСКАЯ: — Трэба абавязкова пакінуць самі назвы “Сучасны танец” або “Сучасная харэаграфія”. Эстрадныя і народныя танцы больш распаўсюджаны, іх добра ведаюць, а сучасныя, на якія прагназуецца вялікі попыт, трэба развіваць і падтрымліваць з дапамогай такіх мерапрыемстваў, як наш конкурс.

Наступны конкурс пачнецца ўжо вельмі хутка!

Тадэуш СТРУЖЭЦКІ: — Трэба дакладна вызначыць мэты і задачы конкурсу, каб ён не быў падобны на іншыя. Перш за ўсё — скіраваць яго на папулярызацыю айчыннай культуры. Нацыянальная адметнасць можа стаць галоўнай рысай конкурсу. Неабходна больш шырокае выкарыстанне пад час спаборніцтва аўтарскіх задумак у самым шырокім сэнсе. На конкурсе павінны вылучацца неардынарныя мастацкія задаткі, якія потым можна было б развіваць, каб “Зорка ўзышла над Беларуссю” стала вельмі важнай прыступкай у прафарыентацыі маладых людзей, каму вопытныя прафесіяналы будуць дапамагаць рэалізоўваць іх творчыя магчымасці.

Па-другое, гэтым разам нам відавочна не хапіла часу, каб падысці да падрыхтоўкі конкурсу сістэмна. Наступным разам патрэбна зладзіць шэраг падрыхтоўчых семінараў з удзелам арганізатараў і членаў журы. Гэта тычыцца адбору на самым першым, раённым, этапе, дзе магчымасць суб'ектыўнага падыходу да адбору канкурсантаў — самая вялікая.

Па-трэцяе, сённяшняя гутарка пацвердзіла, што трэба ўдакладняць назвы некаторых намінацый, карэкціраваць узроставы цэнз.

Па-чацвёртае, конкурс павінен быць па магчымасці самадастатковым, самастойна рэалізоўваць сваю ідэю праз пэўныя намінацыі. Думка наконт працы фатографаў-канкурсантаў пад час сцэнічных праглядаў у гэтым сэнсе вельмі ўдалая. Можна пашырыць гэтую ідэю, напрыклад, на намінацыю “Рэжысура масавых святаў...”, прапанаваўшы яе ўдзельнікам стварыць сцэнарый цырымоніі самога конкурсу.

Безумоўна, усе гэтыя высновы знойдуць месца ў рашэннях аргкамітэта будучага конкурсу, падрыхтоўку да якога, дарэчы, трэба пачынаць ужо сёння, каб праз два-тры гады, калі стартуюць новыя адборачныя этапы, яны праводзіліся з улікам сёлетняга досведу.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Святлана Гуткоўская.

Павел Іваноў.

Уладзімір Зінкевіч.

Антон Сідарэнка.

Ігар СІГОЎ: “Я не збіраюся спыняцца!”

Напэўна, ніводны з айчынных артыстаў не мае столькі інфармацыйных нагод для сустрэчы з журналістамі, як акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Ігар СІГОЎ.

Сёння Ігар Аляксеевіч у тэатры працуе над новай роляй у п’есе Алены Паповай “Сонечка”; літаральна на мінулым тыдні на Першым канале адбылася прэм’ера серыяла “Замах” Аляксандра Яфрэмава з удзелам акцёра... Нельга абысці ўвагай і дакументальна-мастацкі праект “Гарады... Героі...” на АНТ, дзе Ігар Сігоў задзейнічаны як вядучы. А яшчэ немагчыма забыцца на славутую паездку беларускага акцёра на цырымонію “Оскар”, куды ён быў запрошаны як выканаўца галоўнай ролі ў стужцы ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан “Дзверы”. Між іншым, на гэтым тыдні стужка кінапрэміі была прадстаўлена беларускай публіцы на сцэне роднага тэатра Сігова.

Гэты праект не забуду!

— Ігар Аляксеевіч, журналісты маюць рацыю, патрабуючы сёння вашай увагі: вы цяпер — адна з самых медыйных персон. Прыемна, што вашу працу можна ўбачыць і ў тэатры, і ў кіно, і на тэлебачанні...

— Так. Сёння я нават займеў магчымасць адпачываць, змяняючы розныя накірункі працы. Да прыкладу, вельмі цікавы і напружаны працэс здымак у мяне цяпер на праекце “Гарады... Героі” тэлеканала АНТ. Я пабываў у такіх славутых подзвігам сваіх жыхароў месцах, як Санкт-Пецярбург, Керч, Адэса, Севастопаль, Мурманск, Валгаград, Тула... — усяго ў трынаццаці гарадах-героях. У кожнага — свая гісторыя мужнасці, подзвіг абаронцаў, які не можа не ўразіць, пакінуць абыякавым. Здымкі, падкрэслю, адбываюцца на месцах! Ды прыкладу, прыязджаем у Мурманск, а там — мінус 12. Здымаем на ўзбярэжжы: страшэнны вецер, холад! І, адпаведна сваёй ролі, я мушу адчуць на сабе ўсе цяжкасці, якія выпалі на долю абаронцаў горада...

На наступны дзень вяртаюся ў Мінск. І — на рэпетыцыю ў тэатр. А тут ужо зусім іншы клімат. Затым — рушу на поўдзень, пасля — зноў дадому. Так і атрымлівалася адпачываць: ад тэатра — на здымках праграмы, і наадварот.

— Калі меркаваць па першых фільмах праекта, “Гарады... Героі” мусіць стаць адным з самых рэйтынгавых дакументальных цыклаў...

— Спадзяюся. Але тое, што стваральнікі праекта зрабілі своеасаблівае вынаходніцтва ў канструкцыі фільмаў, — гэта сапраўды так. Мяркуйце самі. У праекце спалучаюцца розныя стылі: дакументалістыка, тэлевізійная пастаноўка, мастацкае кіно, тэлевізійная графіка. Ды і мне дасталася няпростая роля — гэткага выпрабавальніка-экстрэмала. Даводзіцца і знаходзіцца ў акопах, і будаваць снежныя сховішчы, і плаваць у вадзе, і падпальваць розныя прадметы, і лазіць па катакомбах... Усё гэта хоць і складана часам, але вельмі захапляльна. Ды і галоўнае: у аснове цыкла — неверагодныя гісторыі абароны гарадоў, якія застаюцца ў душы і сэрцы. Калі даведваешся, як людзі змагаліся, трымалі бой, як выжывалі ў тых жа катакомбах, шахтах, што дзеля гэтага выкарыстоўвалі, — гэтыя факты кранаюць неверагодна.

— Вы адразу пагадзіліся на ўдзел у праекце?

— Так. Але рэжысёру праекта Іллі Баранаву і здымачнай групе ў цэлым прыходзіцца нялёгка, бо ім даводзіцца весці шмат перамоў, спалучаць графікі мой і Уладзіміра Гасцюхіна, які ў праекце выступае ў якасці вядучага-апавядальніка, атрымліваць дазволы на здымкі на шэрагу ваенных аб’ектаў... Здавалася б, усё проста, але скаардынаваць намаганні ўсіх удзельнікаў праекта разам, пазбегнуць недарэчнасцей — гэта вельмі складаная і адказная праца. Я з вялікай цікавасцю прымаю ўдзел у праекце і мяркую, што гэтыя здымкі дакладна не забуду!

Адчуваў, што мы — аднадумцы

— Ігар, літаральна ўчора ў вашым тэатры адбыўся грамадскі паказ стужкі “Дзверы” ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан, дзе вы сыгралі адну з галоўных роляў. Карціна прынесла вам заслужаную славу і паездку на цырымонію “Оскар”. Разумею, што вы бачылі фільм неаднойчы, але ці памятаеце вашы ўражанні ад першага прагляду?

— Першы раз я ўбачыў карціну два гады таму. Хуаніта зманціравала стужку і прывезла яе ў Беларусь, каб паказаць невялікаму колу сяброў. Вядома, усе хваляваліся, і я ў тым ліку. А як жа — убачыць сваю працу на экране! Гэты момант для акцёра заўжды асаблівы.

Што да працы Хуаніты, дык зразумеў яшчэ на здымачнай пляцоўцы: яна — прафесійны і адметны мастак. Узровень стужкі толькі запэўніў мяне ў маіх адчуваннях.

— Гэта прытым, што “Дзверы” былі дэбютам рэжысёра?

— Тое, што гэта быў яе першы фільм, абсалютна не адчувалася. Уілсан ведала, што хацела сказаць, якую гісторыю распавесці людзям — на эмацыйным узроўні, на духоўным, на падсвядомым, — і таму, мабыць, усё ў яе і атрымалася. Нават у працы з акцёрамі яна была гранічна канкрэтнай у сваіх патрабаваннях.

У маім выпадку, мы спачатку доўга размаўлялі, каб адчуць адно аднаго, знайсці творчае паразуменне. А потым ужо разумеліся без слоў. Да прыкладу, яна глядзіць у пэўны момант у манітор, і я бачу: нешта яе засмучае. “Што не так?” — пытаюся. Яна ў адказ паціскае плячыма. “Добра, давай паспрабуем па-іншаму”, — кажу. І спрабую сыграць інакш. Вось так, на нейкай “птушынай мове”, на невербальным узроўні і дамагаліся вынікаў. І гэта было абсалютна натуральна: бо я адчуваў — што мы аднадумцы.

Трэба адзначыць, што ўся каманда Хуаніты была вельмі прафесійнай. Асабліва адзначу аператара, які прымаў удзел у здымках фільма Мэла Гібсана “Храбрае сэрца”. Ягоны ўнёсак у стужку быў вельмі істотны.

— Як, дадам, і праца акцёраў...

— Так. Добра сыгралі і Джульета Казакевіч-Герынг, выпускніца нашай Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якая цяпер працуе ў маскоўскім тэатры “Школа сучаснай п’есы”, і Ліля — маленькая кіяўлянка, што праяўляла пад час здымак проста цуды гераізму.

Самае цікавае, што ў Галівудзе фільм дэманстраваўся на рускай мове з англійскімі субцітрамі. Хуаніта сказала, што тыя эмоцыі, якія нараджаюцца ў нас, тое, як мы гаворым, наша маўленне — усё складаецца ў адзінае цэлае. І калі змяніць штосьці ў створаным — гэта ўжо не будзе праўдай.

“Оскар” паказаў мне, што ўсё магчыма

— Якія асноўныя ўрокі вы атрымалі пад час здымак карціны?

— Нягледзячы на тое, што “Оскар” стужка не атрымала, лічу: той вынік, якога каманда дасягнула сваёй працай, — цудоўны. Трапіць з 500 прэтэндэнтаў у пяцёрку лепшых — гэта сапраўды пачэсна. Акрамя намінацыі на згаданую прэмію, “Дзверы” заваявалі ўзнагароды і прыцягнулі ўвагу публікі на шматлікіх еўрапейскіх кінафестывалях: у Ірландыі, Шатландыі, Італіі, Польшчы... Хуаніта, па сутнасці, зрабіла вельмі простую, але геніяльную рэч: яна — ірландскі рэжысёр, мы — беларускія, расійскія і ўкраінскія акцёры, а ў выніку нарадзілася гісторыя, якая кранае кожнага жыхара планеты.

Галоўны ўрок, які я вынес, — гэта годнае стаўленне да сваёй працы. Калі мы працавалі над фільмам — усё і ўсе знаходзіліся на сваіх месцах, і кожны ведаў, чым ён мусіць займацца. Здымкі карціны адбываліся толькі шэсць дзён, але гэта былі тыя шэсць дзён, калі ніводная хвіліна не была згублена. Ішлі здымкі адной сцэны — у гэты ж час дэкаратары ціхенька рыхтавалі іншую пляцоўку...

— Ёсць такая прыкмета, якую распавёў аніматар Аляксандр Пятроў, оскараўскі лаўрэат: кажуць, што калі дакрануцца да “Оскара” — то прыйдзе поспех. Вам пакуль дакрануцца да яго не ўдалося, але, магчыма, ён вам штосьці “паабяцаў”?

— Галоўнае, што ён мне паведаміў: усе галівудскія акцёры — такія ж людзі, як і мы. Толькі размаўляюць па-англійску. Мне ўдалося сустрэцца ў неафіцыйнай абстаноўцы з Сандрай Балак, Мэрыл Стрып, Квенцінам Таранціна, Кіану Рыўзам... І зблізку адкрываецца простая ісціна: яны маюць тыя ж самыя паўсядзённыя праблемы, што і мы.

Яшчэ “Оскар” зрабіў для мяне вельмі важную рэч: ён паказаў, што ўсё магчыма. Здаецца, працуеш днямі і начамі, год за годам, а тут раптам штосьці адбываецца — і здзяйсняецца твая запаветная мара.

Гэта вельмі важна. Пасля цырымоніі я вярнуўся дадому з жаданнем працаваць больш аддана, з верай, што ўсё можна зрабіць яшчэ лепш, толькі трэба быць больш патрабавальным да сябе. “Оскар” стаў для мяне той прызмай, што дазволіла ўбачыць свет па-іншаму.

— Таму цяпер у вас столькі праектаў?

— І я не збіраюся спыняцца. Сёння ў тэатры ідуць рэпетыцыі п’есы “Сонечка” Алены Паповай, якую яна напісала па матывах твора Фёдара Дастаеўскага “Злачынства і пакаранне”. У спектаклі я іграю Свідрыгайлава. Прэм’ера пастаноўкі чакаецца ў ліпені. Спрабуюся таксама ў шматлікіх кінапраектах. У цэлым, у мяне з’явіўся імпэт да працы, і я жадаю, каб гэты настрой не пакідаў мяне. Бо ёсць яшчэ куды расці!

Гутарыла Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

“Хрустальныя буслы”

Як паведамілі “К” у Міністэрстве культуры Беларусі, Рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў пройдзе ў Брэсце 20 — 24 чэрвеня 2010 года.

Ён арганізаваны па рашэнні Міністэрства культуры і Брэсцкага аблвыканкама. Мэтай яго правядзення з’яўляецца павышэнне ролі нацыянальнай кінематаграфіі ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства, захаванне і развіццё традыцый нацыянальнага кінамастацтва.

Насычаная праграма складаецца з дакументальных, ігравых і анімацыйных фільмаў беларускай вытворчасці, створаных у перыяд з 2007 па 2010 гады. Асаблівая ўвага надаецца творчасці маладых кінематаграфістаў — выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Акрамя конкурснай праграмы, упершыню ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі пройдуць паказы і творчыя мерапрыемствы: рэтраспектывы, сеансы Памяці, выстаўкі, сустрэчы кінематаграфістаў і гледачоў у працоўных калектывах і навучальных установах.

На фестываль запрошаны вядомыя беларускія кінематаграфісты, а таксама госці з іншых краін з мэтай правядзення майстар-класаў для пачынаючых творцаў, студэнтаў адпаведных факультэтаў.

Прыз фестывалю — “Хрустальныя Буслы” — будзе ўручацца па намінацыях: “За лепшы фільм фестывалю” (Гран-пры), “За лепшую мужчынскую ролю”, “За лепшую жаночую ролю”, “За лепшую рэжысуру”, “За лепшы сцэнарый”, “За лепшае музычнае афармленне”, “За лепшае выяўленчае вырашэнне”, а таксама прадугледжаны спецыяльныя прызы фестывалю, заснаваныя разнастайнымі арганізацыямі.

Фестывальныя паказы пройдуць у найбуйнейшым брэсцкім кінатэатры “Беларусь”.

Еўрапейскае кіно

10 мая ў нашай краіне распачаўся Фестываль еўрапейскага кінамастацтва. Мерапрыемства праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, 15 пасольстваў краін Еўрапейскага Саюза.

Фестывальная праграма ўключае фільмы розных жанраў: ад казкі да гістарычнай драмы. Усяго будзе паказана 17 фільмаў з 16 краін Еўропы. І першы з іх — беларускі фільм “Рака жыцця” рэжысёра Ігара Бышнёва, які быў прадстаўлены гледачам 10 мая ў сталічным кінатэатры “Перамога”.

Цягам тыдня — з 10 па 17 мая — мінчане змогуць убачыць фільмы “Шэрлак Холмс” (рэжысёр — Гай Рычы, Велікабрытанія), “Ідыёт” (П’ер Леон, Францыя), “Аір” (Анджэй Вайда, Польшча), “Слёзы красавіка” (Аку Лоухімiес, Фінляндыя), “Полымя і Цытрон” (Оле Крысціян Мэдсэн, Данія) і многія іншыя.

Пасля фестываль перамесціцца на Магілёўшчыну: у абласным цэнтры з 24 па 30 мая, а потым і ў Бабруйску — з 1 па 4 чэрвеня — будуць таксама прадстаўлены фільмы з шэрагу краін Еўропы.

Наш кар.

Фестываль “Art.Intouch”, што прайшоў у сценах Музея сучаснага выяўленчага мастацтва і Нацыянальнай школы прыгажосці, рызыкаваў стаць чарговай бязладнай сумессю “бульдогаў і насарогаў”. Лік удзельнікаў фэсту — нешта каля 30 — ад пачатку ўнушаў перасцярогу. Але... Яна аказалася дарэмнай. Цікаўны чалавек, які даўно хацеў даведацца, што ўяўляе з сябе сучаснае беларускае мастацтва, урэшце здолеў атрымаць уцямны ды пераканаўчы адказ.

“Дотык” адбыўся. Ніхто не абпаліўся

“Калектыўны партрэт” у мазаіцы

Сваім памкненнем “праявіць беларускі кантэкст сучаснага культурнага працэсу” куратары “Дотыку” відавочна не адкрылі Амерыкі. За апошнія пару гадоў мінчане ўбачылі не адзін і не два праекты з прэтэнзіяй на падобную рэпрэзентацыйнасць. Таму асаблівую ўвагу выпадае звярнуць на адметнасці дадзенага фэсту: менавіта яны абумовілі тое, што “калектыўны партрэт” сучаснага беларускага мастацтва гэтым разам сапраўды атрымаўся. Вядома, перадусім — у галаве гледача.

Галоўная з гэтых адметнасцей — без сумневу, праца куратараў. Паняцце, якое ў айчынным арт-працэсе паранейшаму здаецца неалагізмам, урэшце набыло сэнс. “Art.Intouch” прадэманстраваў не толькі яго змест, але і важнасць. Як выявілася, арт-праект ад так званай “брацкай магілы” ў выглядзе выстаўкі адрознівае менавіта наяўнасць куратараў — сапраўдных, а не намінальных. У дадзеным выпадку іх спіс выглядае досыць разнародным: знаны мастацтвазнаўца, выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Яўген Шунейка, аўтар ідэі “Дотыку” Зміцер Ладзес (у мастацкай частцы фэсту ён, зрэшты, выконваў, перадусім, “тэхнічную” функцыю) і два незнаёмыя прозвішчы, на якія, аднак, варта звярнуць асаблівую ўвагу, — Ганна Родзіна і Вольга Рыбчынская.

Менавіта яны выступілі аўтарамі эксплікацый, якімі суправаджаўся кожны выстаўлены твор. Гэтая тытанічная праца адметная не маштабам, але якасцю: мастацкія практыкі папраўдзе вартых увагі творцаў былі асэнсаваны і прадстаўлены гледачам з дапамогай адпаведнай іх глыбіні славеснай метамовы. Думаецца, на Беларусі ёсць не адзін аўтар, што можа паскардзіцца на брак тых рэфлексій адносна ўласнай творчасці, чый узровень быў бы адэкватны яго ўласнай свядомасці.

І нічога страшнага, што чытаць тыя філасафічныя тэкстоўкі было трохі складана! Публіка стамілася выключна ад агульных фраз. Стамляцца ад глыбіні куратарскай думкі наведвальнікам выставак не было калі.

У адрозненне ад некаторых сваіх замежных калег, куратары “Дотыку” не імкнуліся стварыць “марыянеткавы тэатр”, “выкарыстоўваючы” аўтараў дзеля адлюстравання ўласных ідэй. Яны зрабілі тое, што і павінны рабіць куратары: якасна рэпрэзентаваць матэрыял. Адабраны, зрэшты, імі самімі, прычым з усёй адказнасцю за гэты асабісты выбар.

Творам, без якіх можна было б і абысціся, у экспазіцыі месца не знайшлося. Ля кожнага з іх варта падоўгу затрымацца: гэта шматпластавыя кампазіцыі Наталлі Залознай, з іх папраўдзе непадуладнай вербалізацыі метафізікай; выверанымі фармалістычныя эксперыменты Сяргея Кірушчанкі; своеасаблівы “трыб’ют” Магрыту ад Андрэя Бур’яка, які ніяк не зблытаеш з эпігонствам; свядомыя скажэнні ракурсу Тацяны Радзівілкі; вырабы са шкла Вольгі Сазыкінай, мэта якіх — быць прызмай для пераўвасаблення звычайных музейных лямпаў; геаметрычная выверанасць “серыйных” вобразаў Аляксея Іванова... Шматкроп’е — невыпадковае: пералік можа доўжыць.

Частка праекта, якая прайшла ў прасторным фае Нацыянальнай школы прыгажосці, была арганізавана паводле вядомай грузінскай прымаўкі: каб адчуць смак віна, не трэба выпіваць бочку — дастаткова некалькіх глыткоў. Вялізную прастору запоўнілі з дзесятак аўтараў — і столькі ж твораў. Затое кожны з іх з’яўляецца своеасаблівым акенцам у свет свайго стваральніка. Такая лаканічнасць дазволіла сфармуляваць (або актуалізаваць?) паняцце “культура экспазіцыі”. Нічога залішняга, ніякіх “слабых звенняў”... Затое — сапраўднае адкрыццё: у адну абойму з ужо вядомымі Алесем Родзіным, Леанідам Хобатавым і Канстанцінам Селіханавым трапіў і зусім малады мастак — Захар Кудзін, з яго надзіва зачэпістым экспрэсіяністычна-беканаўскім уменнем класці фарбы на палатно.

Тры сцяны маленькай залы Музея сучаснага выяўленчага мастацтва пароўну падзялілі тры карыфеі беларускага “канцэптуальнага” фота: Ігар Саўчанка, Сяргей Кажамякін і Сяргей Ждановіч. Іх выказванні былі на адну тэму, якая многім можа падацца банальнай: родны горад Мінск. Але ж гэты своеасаблівы міні-праект — у адрозненне ад плоймы падобных — дасягнуў даўгачаканага сацыяльнага выніку: мінчане здолелі ўбачыць сталіцу ў іншым святле. Прычым без дапамогі абрыдлых “фоташопных” дзівосаў. Кожны з трох аўтараў здолеў па-свойму ўвасобіць амбівалентную ўласцівасць фатаграфіі — яе рэалістычнасць і, адначасова, іррэальнасць. Прастора паміж гэтымі двума палюсамі — жыццядайная глеба іх натхнення. Цэнтральны твор экспазіцыі — camera obscura, усталяваная Сяргеем Ждановічам проста на акно музея, з відам на гарадскі тлум. Наватарства або традыцыяналізм? Аўтарская практыка.

...Від мастацтва, дзе можа быць выкананы партрэт сучаснага арт-працэсу, — гэта, безумоўна, мазаіка. Прычым у дадзеным выпадку яго належыць ствараць з разнародных кампанентаў, надаваць якім патрэбныя для аўтара колер і форму — катэгарычна забаронена. Але ў выніку вобраз, здаецца, склаўся. Таму падсумуем: contemporary-art — гэта не эпатаж (яго куратары ветліва абмінулі ўвагай), а глыбокія аўтарскія практыкі, якім уласцівы арыгінальныя ды спецыфічныя формы выяўлення. А таксама — інтэлект і асабістая культура іх стваральнікаў. Для многіх такі партрэт атрымаўся трохі нязвыклы. Але менавіта за гэты кагнітыўны дысананс варта асабліва падзякаваць куратарам. Таму... “Дотык” да сучаснага мастацтва — адбыўся. Ніхто не абпаліўся.

Ілля СВІРЫН

На здымках: фрагменты экспазіцыі ў Нацыянальнай школе прыгажосці.

Заўсёды цікава сачыць за творчасцю мастака, які ў развіцці свайго творчага “Я” не спыняецца на дасягнутым — шукае новыя формы і зместы. Асабліва прыемна адкрываць для сябе новыя, нечаканыя грані таленту аўтара, што, здавалася б, ужо канчаткова адбыўся як творца. Менавіта такім адкрыццём для многіх сталічных аматараў мастацтва стала выстаўка жывапісу Уладзіміра Савіча “Фрагменты” ў галерэі “Мастацтва”.

“Апрануцца” ў святло

Фрагменты разгаданага жыцця

У.Савіч. “Апрануты ў святло”.

Знаны майстар кніжнай і станковай графікі, Савіч упершыню ў Мінску прадставіў свае жывапісныя творы.

Шматгадовае прытрымліванне графічных традыцый адбілася і на жывапіснай манеры Савіча: палотны, напісаныя алеем і яшчэ больш мяккай тэмперай, не пазбаўлены графічнасці, у пэўных дэталях нават рэзкаватыя. Лінія і колеравая пляма ў творах мастака не менш значныя, чым у графіцы.

Збліжае з графікай жывапіс Савіча і адыход ад сюжэтнасці, апавядальнасці. Але майстар удала карыстаецца і набыткамі жывапісу: насычаны, “густы” каларыт робіць палотны вельмі экспрэсіўнымі, эмацыянальнымі, хвалюючымі. Колеравыя плямы з ледзь заўважнымі постацямі, альбо, наадварот, дэталёва прапісаныя твары людзей, але — у абрамленні ўсё тых жа дэкаратыўных колеравых напластаванняў, — гэта і найвышэйшай мастацкай вартасці метафары, і, у той жа час, рэальныя месцы і людзі. Густы, насычаны мазок — і пераасэнсаванне рэчаіснасці, і асацыяцыя аўтара. Таму палотны Савіча — нібы ключы да спасціжэння ўнутранай сутнасці таго, што мастак бачыў на ўласныя вочы і што перадаў жывапіснымі мазкамі на палатне. “Койданаўскія муры” і “Старыя камяніцы”, “Святы Казімір” і “Апрануты ў святло” — усё гэта ўжо разгаданыя, прачытаныя мастаком моманты жыцця. І сёння ён прадастаўляе унікальную магчымасць “дакрануцца” да іх і гледачу.

У.Савіч. “Старыя камяніцы”.

Дар’я ДАНІЛЕВІЧ

Балада пра рух

Шматгалоссе і перазовы “Харошак”

З праграмы “Беларусы”.

Рэчаіснасць пераконвае: аднаразовыя акцыі, якімі яркімі яны ні былі б, даволі часта губляюцца ў разнастайнай плыні музычных уражанняў. Год таму аркестр Беларускага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі” прэзентаваў у Белдзяржфілармоніі сваю першую манаграфічную праграму. Яна мела назву “Прадчуванне кахання”. Праграма моцна здзівіла — і аматараў, і прафесіяналаў. Чаму?

“Харошкі”, стваральнікам і нязменным кіраўніком якіх з’яўляецца славутая Валянціна Гаявая, заўсёды пазіцыянаваўся як самабытны харэаграфічны калектыў. Невялікая інструментальная група, якую меў ансамбль, выконвала сольныя нумары, але яе прызначэнне было прыкладное.

Тры гады таму кампазітар Марына Марозава зрабілася музычным кіраўніком аркестра. Дзякуючы яе прапанове склад яго пашырыўся, фактычна да камернага. Шырокі розгалас, які меў дэбютны канцэрт аркестра, прымусіў і Марозаву, і музыкантаў задумацца наконт працягу. Менавіта так нарадзіўся праект “Дотык”, які быў паказаны сёлета ў красавіку ў межах Міжнароднага фестывалю “Мінская вясна”. Такім чынам аркестр прадоўжыў цыкл сваіх камерных вечарын.

Праграма “Дотык” рыхтавалася цягам апошняга паўгоддзя. Найперш кампазітар зрабіла для яе шмат новых аркестровак. Гэта датычыць і нумароў, якія гучаць у канцэртах “Харошак”, і аўтарскай музыкі. А ўслед за стварэннем новых партытур прыйшоў час напружанай рэпетыцыйнай працы аркестра. І калектыў, і ягоныя асобныя салісты прадэманстравалі чуйнае ансамблевае гучанне.

Наталля Бранцлоўская.

Супадзенне творчых інтарэсаў “Харошак”, аркестра і М.Марозавай — невыпадковае. Марына паспяхова працуе ў розных жанрах, пра што сведчыць яе супрацоўніцтва з многімі калектывамі. Але найбольш відавочныя яе поспехі — у галіне раманса, а таксама інструментальнай мініяцюры.

Ды і інструментальныя нумары, музыка для струннага квартэта, што прагучалі на канцэрце, пераканалі: і тут М.Марозава — бясспрэчны майстар, які ўмее “падаць” прыгажосць гучання асобнага інструмента, адметнасць тэмбральных фарбаў. Пяшчотна і загадкава прагучалі ў выкананні аркестра п’есы “Вечар у замку”; як пераасэнсаванне рытмаў і гармоній С.Пракоф’ева ўспрымалася віртуознае сачыненне “У руху”. Таямнічая “Меланхолія” прымусіла шкадаваць, што твор невядомы беларускім кінематаграфістам, інакш мог бы ўспрымацца як выразная лейттэма кінафільма.

Музыка праграмы “Дотык”, з аднаго боку, вельмі жаноцкая, прыгожая і вытанчаная, давала слухачу дзівосную магчымасць паглыбіцца ў надзвычай гарманічную гукавую прастору. І разам з тым, у аркестроўках, ва ўменні з’яднаць у партытуры галасы розных інструментаў, пачуць іх шматгалоссе і перазовы, адчуваецца ўпэўненая, цвёрдая і, так бы мовіць, мужчынская рука. Кампазітару цікава эксперыментаваць з тэмбрам розных інструментаў, супастаўляць іх, выплятаючы нечаканыя ўзоры.

Праект відавочна меў некалькі сэнсавых частак. Найперш — музыка, наноў аркестраваная кампазітарам для “Полацкага сшытка” і танцавальных праграм “Харошак”. А таксама — аўтарскія інструментальныя кампазіцыі і мініяцюры (сярод іх своеасаблівай эмацыйнай кульмінацыяй успрымаўся “Жытнёвы раманс”). У вакальнай музыцы таксама прысутнічалі розныя накірункі: творы баладнага гучання (“Князёўна”, “Балада пра стралу”), акадэмічны раманс, а яшчэ — фальклорная плынь, якую ўвасаблялі вакалісты саміх “Харошак” (тут асабліва цікавымі падаліся Н.Бранцлоўская ў пяшчотна-ласкавай калыханцы “Ходзіць сон…” і В.Бычкоўская ў прачулай акапэльнай песні “Гарэла сэрцайка”). І кожны раз музыка пакідала адчуванне свежасці і навізны, дзе адсутнічаюць меладыйныя і гарманічныя штампы.

Сінтэз розных жанраў і накірункаў — прыкмета сучаснай музыкі. Таму, бясспрэчна, упрыгожылі праграму артыстычнае майстэрства і моцны вакал салістаў нашай оперы Таццяны Траццяк і Уладзіміра Громава. Яны не ўпершыню супрацоўнічаюць з М.Марозавай і аркестрам “Харошак”.

Спадзяюся, рэзананс, які ўжо займеў новы праект аркестра “Харошак”, падштурхне і кампазітара, і калектыў развіваць традыцыю, што нараджаецца на нашых вачах. Як кажуць у такіх выпадках, слухач патрабуе працягу…

Таццяна МІХАЙЛАВА
Фота Андрэя СПРЫНЧАНА і Ігара КУЗНЯЦОВА

* * *

9 мая ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі Дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль “Харошкі” прадставіў святочную вечарыну. Яна складалася з “ваенных” нумароў іх апошняй праграмы “Беларусы”, а таксама лепшых кампазіцый мінулых гадоў. Дадзеным выступленнем знакаміты калектыў не толькі павіншаваў ветэранаў са святам, але і прадоўжыў Грамадска-культурную акцыю “Беларусь — гэта мы!”

— Я ўжо неаднойчы падкрэслівала, — распавядае Валянціна Іванаўна Гаявая, — што акцыя “Беларусь — гэта мы!” папраўдзе наша, родная. Бо практычна ўсё, што мы ставім і паказваем, — пра нас, беларусаў, і ўсіх, хто жыве ў нашай краіне, а таксама тых, для каго яна стала другой радзімай.

Н.Б.

Таццяна Траццяк.

Сола на саксафоне

Штогодовыя справаздачныя канцэрты ўсіх мастацкіх кафедраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў ужо сталі звыклымі. Але сёлета кіраўніцтва навучальнай установы ўпершыню вырашыла сумясціць гэтую традыцыю з шанаваннем удзельнікаў Вялікай Айчыннай: менавіта яны сталі самымі ўважлівымі і прыдзірлівымі “крытыкамі”. Канцэрт, прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі, невыпадкова быў зладжаны ў Доме культуры ветэранаў.

У выкананні лаўрэата міжнародных конкурсаў і фестываляў, канцэртнага аркестра духавых і ўдарных інструментаў “Светач” пад кіраўніцтвам М.Жарко гучалі цікавыя, разнастайныя, складаныя творы, якія сведчылі: за апошнія гады гэты калектыў дасягнуў высокага прафесійнага майстэрства. Дырыжор імкнуўся як мага ярчэй раскрыць тэмбравыя фарбы, пашырыць дынамічныя, выразныя і тэхнічныя бакі інструментаў. Асабліва запомнілася музычная кампазіцыя “Песні нашай Перамогі” (у апрацоўцы і пад кіраўніцтвам С.Горына).

Брас-квінтэт пад кіраўніцтвам С.Сітнікавай прадэманстраваў шматтэмбравае спалучэнне інструментаў джазавай групы. Арыгінальна і нязвыкла гучалі трамбон І.Станкевіча (клас С.Працэнкі), саксафон лаўрэата міжнародных конкурсаў, стыпендыята спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі А.Гайкевіча (клас Я.Шыманца). Вылучыўся і ансамбль ударных інструментаў пад кіраўніцтвам А.Сапегі, які выканаў яго аўтарскі твор “Слава героям”. Такі творчы падыход выкладчыкаў (стварэнне імі пералажэнняў, апрацовак і нават арыгінальных твораў) дапамагае пашырыць рэпертуар.

Аркестравыя духавыя інструменты змяніліся народнымі: сваю праграму прадставіла лаўрэат міжнародных, рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў Капэла беларускіх народных духавых інструментаў “Гуды”. Калектыў з гонарам носіць імя заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Грома, які з’яўляўся ініцыятарам стварэння ва універсітэце не толькі Капэлы, але і ўсяго аддзялення народных духавых інструментаў. Капэлай кіруе кампазітар, дацэнт І.Мангушаў, які падрыхтаваў да канцэрта сваю чатырохчасткавую музычную замалёўку “А ў нашым сяле вяселле…”. Папраўдзе бісернай тэхнікай уразілі выканаўцы на дудках А.Барыгін, К.Дранаян-Барбоўскай (клас знакамітага дырыжора Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І.Жыновіча, дацэнта А.Крамко). Уласны ж твор А.Крамко “Ох, без дудкі, без дуды — ходзяць ногі не туды” выканала лепшая студэнтка 4 курса, лаўрэат міжнародных конкурсаў Я.Гараніна (клас І.Мангушава), якая грала на дудцы, жалейцы, акарыне.

Генадзь МІШУРОЎ,
доктар мастацтвазнаўства, прафесар БДУКіМ
На здымку: ветэраны ў атачэнні маладых талентаў.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Сіла інтэрпрэтацыі

Той канцэрт у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі не быў пазначаны ў зводных афішах, на яго не прадаваліся білеты. Бо гэта быў дабрачынны вечар для ветэранаў, здзейснены са спонсарскай дапамогай. І пачаўся ён з ушанавання тых, хто 65 гадоў таму падарыў нам мір. А галоўнай падзеяй сталася канцэртная праграма, падрыхтаваная пад кіраўніцтвам дырыжора, дэкана факультэта музычнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва Вячаслава Бартноўскага.

— Мой бацька, — прызнаўся Вячаслаў Віктаравіч ужо пасля канцэрта, — прайшоў усю вайну. Год таму яго не стала. Ветэранаў усё менее. І пакуль мы жывыя, павінны памятаць пра іх, падтрымліваць, адорваць іх сваёй увагай, клопатам, творчасцю — і не толькі ў святы.

Першае аддзяленне склала кантата “Аляксандр Неўскі” С.Пракоф’ева. Гэтая музыка яшчэ з перадваенных гадоў, калі з ёй выйшаў аднайменны фільм С.Эйзенштэйна, сталася сімвалам моцы духу, непераможнасці народа, які адстойвае сваю незалежнасць. Таму ў святочныя праграмы дадзены твор трапляе, мабыць, часцей за іншыя. Але чарговае выкананне не аказалася шараговым. Зводны аркестр, створаны з Дзяржаўнага камернага, да якога далучаліся лепшыя музыканты з усіх вядучых калектываў, дэманстраваў багацце сімфанічных фарбаў: ад стрыманай напружанасці да абаяльнай празрыстасці, ад пагрозлівай ваяўнічасці да святочнага бляску. Далучыце бездакорны прафесіяналізм Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р.Шырмы пад кіраўніцтвам народнай артысткі Беларусі Людмілы Яфімавай — і вы зразумееце, што на сцэне сабралася ледзь не дзвюхсоценная “дружына”. Салісткай выступіла Вольга Шаўчэнка. Яе гераіня, што аплаквае загінуўшых, паўстала моцнай духам жанчынай-ваяркай, гатовай узяцца за зброю, каб замяніць мужчын.

Другое аддзяленне ўтрымлівала не толькі асобныя вакальныя нумары (з іх асабліва ўразіў Раманс Жэнькі з оперы К.Малчанава “А досвіткі тут ціхія” і вельмі эмацыйны, з прыхаванай трывожна-нервовай вібрацыяй, голас выпускніцы Акадэміі музыкі Юліі Воляк). Тут была і цэласная літаратурна-музычная кампазіцыя, аздобленая кінакадрамі, і, для фіналу, уверцюра “1812 год” П.Чайкоўскага. Спалучэнне розных твораў, іх прымеркаванасць да Вялікай Перамогі накладалі свой адбітак на інтэрпрэтацыю. Харальныя гучанні ў сцэне з оперы “Сельскі гонар” П.Масканы нагадвалі павольна-ўрачысты марш. Кульмінацыя ж Малітвы Сантуцы (салістка Беларускай оперы Алена Золава) была такой магутнай, што магла параўнацца са сцэнай з вердзіеўскай “Аіды”.

Ды ўсё ж галоўнай “разыначкай” канцэрта стала літаратурна-музычная кампазіцыя. У цэнтры яе апынуўся фрагмент “Ленінградскай” сімфоніі Д.Шастаковіча — знакамітая “тэма нашэсця”. Паабапал — два Рэквіемы: Р.Ражджэсцвенскага (Валерый Анісенка чытаў яго наўмысна хрыплаватым, быццам стомленым голасам, без залішняй тэатральнай інтанацыі) і… Моцарта. У нечаканым суседстве “Lacrimosa” загучала больш узрушана, нават крыху маршава, дый завяршылася на амаль пераможных нотах.

“Не мой”: агонь і дым

Напярэдадні святкавання Вялікай Перамогі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы прадставіў прэм’еру — спектакль “Не мой” паводле Алеся Адамовіча. Пад час грамадскага прагляду зала Купалаўскага ледзь змясціла ўсіх ахвотных пазнаёміцца з новай тэатральнай работай, прысвечанай тэме Вялікай Айчыннай вайны, убачыць увасобленыя на сцэне “памкненні душы”, якія падштурхнулі рэжысёра Аляксандра Гарцуева звярнуцца да гэтага матэрыялу.

Ды толькі па заканчэнні спектакля размовы сярод гледачоў у большасці сваёй тычыліся таго, як… нечакана і эфектна на сцэне было перададзена спальванне вёскі. Мастак спектакля Барыс Герлаван, які заўсёды славіўся ўменнем ствараць маштабную і метафарычную сцэнаграфічную прастору, выкарыстаў гэтым разам найноўшыя оптыка-валаконныя тэхналогіі. Таму эпізод знішчэння Петухоў сваёй гіперрэалістычнасцю ўспрыняцця насамрэч зрабіў на гледачоў абсалютна нечаканае ўражанне (цягам усёй дзеі рэшткі дамоў — бярвенні — тлелі не ўмоўна-тэатральна, а практычна “па-сапраўднаму”). Але ж ці толькі гэта мусіла быць творчым вынікам спектакля?..

Між іншым, чаканне прэм’еры ў Купалаўскім мела пад сабой некалькі творчых інтрыг. Не так даўно паводле гэтай жа аповесці А.Адамовіча — “Нямко” — расійскім кінарэжысёрам Міхаілам Сегалам быў зняты фільм “Франц + Паліна” з цікавымі і яркімі работамі і беларускіх акцёраў (у прыватнасці, Тамара Міронава ў абодвух версіях — кінематаграфічнай і тэатральнай — сыграла маці Паліны, Кучарыху). Меркавалася, што тэатральная версія аповесці стане своеасаблівым дыялогам з кінаработай. Тым больш, што, у адрозненне ад фільма, дзе ў галоўных ролях былі занятыя расіянка і немец, на Купалаўскай сцэне перад гледачамі мусілі паўстаць дзве пары айчынных маладых і яркіх тэатральных акцёраў: Раман Падаляка са Святланай Анікей і Аляксандр Казела з Валянцінай Гарцуевай (балазе пра кожнага з іх, нягледзячы на небагаты пакуль тэатральны багаж, ужо сёння можна пісаць асобныя творчыя партрэты).

Ды толькі самай вялікай “інтрыгай”, так і не разгаданай мною нават у фінале, сталася галоўнае пытанне: пра што спектакль? Выкарыстоўваючы даволі распаўсюджаны для ваенных спектакляў прыём “фіксацыі” сцэн, рэжысёр Аляксандр Гарцуеў раскладвае перад намі своеасаблівы ваенны “фотаальбом”. Тут — ворагі з грамафонам і губным гармонікам, бежанцы і канцлагерны калючы дрот, спаленая вёска і чароды амаль не адрозных паміж сабой атрадаў партызанаў, уласаўцаў, а пазней — МГБістаў… Здаецца, ён спрабуе выцягнуць на свет самыя распаўсюджаныя традыцыі і стэрэатыпы тэатральнага ўвасаблення ваеннай тэматыкі, але — з якой мэтай?

Далей гэты “камплект ведаў” пра вайну практычна не раскрываецца, так і застаючыся на ўзроўні знакаў, зразумелых пакаленню 70-х гадоў мінулага стагоддзя, але абсалютна архаічных і з гэтай прычыны практычна неўспрымальных для гледача сучаснага. Бадай, адзіная акцёрская работа, якая вылучаецца на гэтым фоне, — вобраз пажылой бежанкі ў выкананні Зінаіды Зубковай. Поўная глыбокага і глыбіннага перажывання за жыццё, але зусім не ўласнае, а — людское, за чалавечнасць увогуле, яе гераіня сталася своеасаблівым архетыпам Жанчыны, што прайшла праз вайну, здолеўшы, з аднаго боку, запомніць усе яе жахі і нягоды, а з іншага — не дазволіць сабе і тым, хто аказваўся побач, забыцца на ўласную чалавечую прыроду і страціць яе.

У згаданым вышэй фільме рэжысёр, выносячы ў назву імёны двух галоўных герояў, адпаведна гэтаму будуе і экранны аповед — з пазіцый расказу гісторыі “Рамэа і Джульеты” ваеннага часу. Аляксандр Гарцуеў, называючы спектакль руска-беларускім амафонам “Не мой”, пераакцэнтоўвае нашу ўвагу на асобу Франца — салдата вермахта, які, не падпарадкаваўшыся загаду, выратаваў беларускую дзяўчыну, абараняючы сваё каханне да яе. Кім ён стаў пасля гэтага? Маналог пра ўласную “нічыйнасць” і бялючасць адчування гэтай сваёй “адсутнасці”, неіснавання бліжэй да фіналу спектакля гучыць з вуснаў персанажа Рамана Падалякі. Аднак рэжысёр не падводзіць нас да яго, бо цягам усіх папярэдніх дзей асоба Франца, яго ўнутраныя перажыванні практычна аніяк не выяўляюцца — акцёру прапануецца існаваць у звыклым для яго “амплуа” чужынца (нагадаем, у нядаўнім спектаклі “Translations” Раман Падаляка таксама іграў ролю закаханага ў мясцовую ірландскую дзяўчыну рамантычнага англічаніна). Дзе шукаць прычыны гэтага: у тым, што Гарцуеў не рызыкнуў стварыць спектакль пра душэўныя перажыванні Франца, альбо проста эмацыянальнае памкненне за нешараговым вобразам не знайшло ў ягонай рэжысёрскай “аператыўнай памяці” адпаведных пастановачных рашэнняў?..

Млявасць вобраза Франца з лішкам кампенсуе Паліна ў выкананні Святланы Анікей. Яе гераіня — з тых, што сапраўды здольныя не толькі “спыніць на скаку каня”, але і самой упрэгчыся ў вазок, каб уратаваць каханага. Актрысе ўдалося востра і эмацыянальна адчуць і ўвасобіць усю пранізлівасць адначасовага спалучэння такіх эмоцый, як паралізуючы жах і неверагоднае жаданне жыць. Акурат гэтым акцёрская ігра Святланы Анікей у многім і апраўдвае адсутнасць рэжысёрскага “падмурка” для іх з Францам ваеннай эпапеі. Бо па ходзе спектакля мы не былі сведкамі ні нараджэння іх кахання (проста, рамантычна настроеная дзяўчына ўночы заляпіла аплявуху надта смеламу хлопцу), ні ўзнікнення пачуцця ўдзячнасці ворагу, якому яна ратуе жыццё ўзамен уратаванага ейнага. Здаецца, гераіня Анікей успрымае і самога Франца не столькі як асобу і мужчыну, колькі — як падсвядомы абавязак выратаваць Жыццё, захаваць у сабе, у сваёй душы чалавечнасць. Акурат гэтая яе магутная эмацыянальная зараджанасць на жыццё і становіцца той “птушкай Феніксам”, якая пасля кожнай новай сцэны, што не абяцае аніякага іншага фіналу, акрамя смерці, дае сілы адраджацца наноў і ёй, і яе Францу.

…У фінале героі спектакля з “сямейнай фотакарткі” прамаўляюць да нас, гледачоў, простыя словы пра тое, што мы сваім жыццём абавязаны тым, хто прайшоў вайну. Перад намі — аксіёма, якую не патрэбна даказваць. Але казаць пра гэта і сёння можна толькі праз уласны эмацыянальны боль і жывое суперажыванне тым, хто прайшоў вайну і захаваў для нас Жыццё, — і ніяк інакш.

Т.К.

На здымках: сцэны са спектакля “Не мой”. Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Напачатку быў… сцэнограф

13 мая ў галерэі Музея гісторыі беларускага кіно адкрылася выстаўка работ тэатральных мастакоў “Вынікі сезона 2009 — 2010”. Яе арганізатарамі, па-традыцыі, выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі саюз мастакоў, Беларускі саюз тэатральных дзеячаў і Музей гісторыі кіно.

Шэрагі “цяжкой артылерыі” склалі такія вопытныя мастакі тэатра, сярод якіх — Аляксандр Касцючэнка з эскізам дэкарацый да оперы “Набука” Дж.Вердзі і макетам да балета “Папялушка” С.Пракоф’ева ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета, Валерый Рачкоўскі з эскізам дэкарацый да “Прыгажуні і пачвары” А.Жугжды ў тэатры лялек Ольштына (Польшча) і эскізам лялек да спектакля “Марынка-крапіўніца” А.Вольскага і П.Макаля ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, Віктар Цімафееў з макетам і эскізамі дэкарацый і касцюмаў да “Ветрагонаў” У.Галубка ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа і іншыя.

Прыемнай асаблівасцю сёлетняй выстаўкі стаў і магутны выхад на творчую авансцэну маладых тэатральных мастакоў, што натуральным чынам адлюстроўвае існуючае становішча ў сучасным беларускім тэатры: за апошнія два-тры гады менавіта яны, нядаўнія выпускнікі Барыса Герлавана, сталі ў многіх выпадках “рабіць моду”. Пацвярджаючы той факт, што творчы імпэт, з аднаго боку, і валоданне сваёй прафесіяй, з іншага, — здольныя даваць плённыя вынікі, якія мы і атрымалі магчымасць убачыць на выстаўцы.

Сярод іх — Алеся Снапок, якая цягам сезона працуе галоўным мастаком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, Андрэй Меранкоў, Дар’я Волкава, Вольга Грыцаева, Ігар Анісенка, Тацяна Нерсісян, Валянціна Праўдзіна. Кожны з іх ужо заявіў аб сваім творчым стылі ў тэатры, і іх новыя работы, безумоўна, даюць дадатковую глебу для далейшых разважанняў на гэты конт.

На жаль, як і ў мінулым годзе, не так шмат на выстаўцы было прадстаўлена работ, ажыццёўленых на сцэнах абласных тэатраў. Сярод гарадоў, тэатры якіх адзначыліся на выстаўцы, — Віцебск і Магілёў, куды былі запрошаны сталічныя сцэнографы. Толькі Гродзенскі абласны драматычны тэатр прадставіў работы свайго мастака Тацяны Сакалоўскай: макет, эскізы дэкарацый і касцюмаў да спектакля “Прымакі” паводле Янкі Купалы.

Т.К.

На здымках: І.Анісенка. Макет да спектакля “Хам” паводле рамана Э.Ажэшка.; Т.Сакалоўская. Макет да спектакля “Прымакі” паводле Янкі Купалы.

Кароль Стах — у Магілёве

Днямі ў Магілёўскім абласным тэатры лялек адбыўся мастацкі савет, на якім была зацверджана п’еса рэжысёра Вячаслава Корнева паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха” і разглядаліся эскізы дэкарацыі да яе. Дзякуючы рашэнню Савета і фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, гэты спектакль пабачыць свет у чэрвені 2010 года.

Рэжысёр тэатра Вячаслаў Корнеў даўно выношваў ідэю ўвасаблення сродкамі тэатра лялек аповесці Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”. Варта адзначыць, што пастаноўка твора класіка на сцэне Тэатра лялек у нашай рэспубліцы адбудзецца ўпершыню.

Творчыя задумы рэжысёра спектакля даюць падставы меркаваць, што новы праект будзе цікавы для сучаснага гледача. Гэта пацвярджае і тое, што ў творчай скарбонцы рэжысёра шмат выдатных работ: “Вій” (“народная хлусня з песнямі і пужалкамі”), прымеркаваны да 200-годдзя з дня нараджэння М.Гогаля, камедыя “Паўлінка” (“народныя гульні з лялькамі”), спектакль “Папялушка” (“вясёлая готыка”), які пастаўлены ў вельмі цікавай сучаснай інтэрпрэтацыі па матывах казкі братоў Грым, а таксама іншыя, не менш цікавыя для гледачоў, творы.

Арыгінальныя мастацкія знаходкі імкнецца задзейнічаць у працы над спектаклем “Дзікае паляванне караля Стаха” галоўны мастак тэатра Галіна Ігнацьева. Музычным афармленнем пастаноўкі займецца Анжэла Дамахоўская, якая з’яўляецца адначасова і куратарам праекта. Таксама вялікія спадзяванні ўскладзены і на прафесійныя здольнасці акцёраў тэатра, сярод якіх — вядучыя майстры сцэны Н.Бачкарова, Г.Барысава, Н.Суворава, Т.Зэлікава, Г.Лазуціна, уладальнік “Крыштальнага Анёлка” і медаля Францыска Скарыны М.Сцешыц.

Іна ПУДЗЯНКОВА,
кіраўнік літаратурнай часткі Магілёўскага абласнога тэатра лялек

Адраджэнне і развіццё сяла: **сацыякультурны зрэз**

"К" зноў звяртаецца да тэмы турызму. І найперш нашу газету цікавіць унёсак кожнага з аддзелаў культуры Беларусі ў выкананне Нацыянальнай праграмы развіцця турызму. Бо, як сведчаць шматлікія матэрыялы, што друкаваліся ў "Культуры", кавалак турыстычнага "пірага" культработнікі краіны пакуль толькі пачынаюць "каштаваць на смак".
Пра Расонскі раён мы пісалі тры гады таму. Калі гаворка вялася пра музейную справу, закранулі і турыстычную сферу. Газета распавяла аб тым, што даволі вялікім попытам у наведвальнікаў раёна карыстаецца маршрут "Блакітныя каралі Расонаў", платныя экскурсіі ў Музей партызанскага побыту пад адкрытым небам, які размешчаны ля вёскі Роўнае Поле, Фестываль сельскага турызму "Заборскі фэст"…
Мінула тры гады. Што ж змянілася? Пры ўсіх відавочных станоўчых прыкладах працы (у раёне наладжаны выраб і продаж сувеніраў, задзейнічаны народны калектыў для абслугоўвання прыезджых, вядуцца платныя музейныя экскурсіі па раёне), як падалося, не ўсе магчымасці аддзела выкарыстоўваюцца напоўніцу.
Як сведчыць народная мудрасць, няма мяжы дасканаласці. Таму і артыкул гэты варта ўспрымаць не як спробу пошуку пралікаў мясцовага аддзела культуры ў турыстычнай сферы, а як чарговую нагоду разам паразважаць над перспектывамі сумеснай працы райвыканкамаўскіх структур у вырашэнні надзённых задач.

Народ пытаецца і прапануе

"Калі паедуць турысты?"

Пад час камандзіроўкі ў Расоны і Расонскі раён гутарыў з жыхарамі краю рознага ўзросту і сацыяльнага статуса. Як падалося, тэма турызму хвалюе кожнага мясцовага жыхара. Тым больш, перспектывы ў развіцці гэтай галіны сацыякультурнага жыцця раёна — вялікія.

Кацярына, студэнтка-завочніца, жыхарка г. п. Расоны:
— Замежнікі да нас ездзяць. Ды і мінчане — таксама. Мае сябры з Мінска прыязджалі ў Расоны на зімовыя канікулы ў госці, наведалі вёску Роўнае Поле, дзе — партызанскія зямлянкі, пакаштавалі там юшкі. І сувеніры набылі, і з нашай прыроды дзівіліся. Але… Гасцей давялося размясціць у сябе: месцаў у гасцініцы не было. Ды і цяпер — таксама, бо ў гасцініцы — рамонт. Рамантуецца адзіны ў гарпасёлку рэстаран, дзе, ведаю, будзе і кафэ. А чаму няма больш кафэшак у нас? І калі ж скончацца рамонты?..

Сяргей, рабочы, жыхар г. п. Расоны:
— Адметнасць нашага раёна — вандроўкі на партызанскія зямлянкі, альбо ў вёску Межна — у Музей партызанскага руху. Гэта вельмі добра, але хочацца нечага новага. Можа, пабудаваць домік Шляхціча Завальні, бо ў нас у раёне ёсць возера Нешчарда, ля якога, у вёсцы Мурагі, нарадзіўся Ян Баршчэўскі?.. Або пусціць цеплаход па адным з нашых азёраў. Было б цікава і мясцовым жыхарам, і прыезджым…

Генадзь, жыхар аграгарадка "Клясціцы":
— У Клясціцах — аж шэсць аграсядзіб! Але, як мне падаецца, вельмі мала тут прапаноўваюць паслуг: шпацыр па лесе ды рыбалка. Да таго ж, і дарогі ў нас не вельмі добрыя, асабліва — восенню, калі дажджы. І тут не магу не пацікавіцца: ці будуць калі-небудзь пракладаць асфальт у раёне? Гэта, пэўна, прывабіла б больш турыстаў у наш край…

Марыя, жыхарка аграгарадка "Клясціцы":
— Гасцей у нашай вёсцы шмат, бо прырода ў нас некранутая і разнастайная, ды і праца для сяльчан такім чынам знаходзіцца. Але, на маю думку, дрэнна, што няма ўказальнікаў ні да аграсядзіб, ні да гістарычных і турыстычна-прывабных мясцін Расоншчыны. Лічу гэта вялікім пралікам мясцовага кіраўніцтва…

Без указальніка Шляхціча

На шляху ад "Блакітных караляў" да Музея Баршчэўскага

Райвыканкамаўская "лятучка" з "К"

У райвыканкамаўскай "лятучцы", зініцыяванай "К", прынялі ўдзел намеснік старшыні Расонскага раённага выканаўчага камітэта Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ, начальнік аддзела культуры Святлана ВОЛКАВА, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Аксана ПАТАПАВА, а таксама старшыня Дзяржаўнай прыродаахоўнай установы "Эка-Росы", падпарадкаванай райвыканкаму, старшыня філіяла Грамадскай арганізацыі "Адпачынак у вёсцы" і ўладальніца адной з аграсядзіб рэгіёна Ала ХАРЭНЬ.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Давайце пачнём нашу гутарку з турыстычных перспектыў гарадскога пасёлка. Бо кожны прыезджы, натуральна, спачатку наведвае Расоны, а потым скіроўваецца ў раён...

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— Сёння мы рамантуем гасцініцу. Яна ў нас вельмі вялікая і за савецкім часам выкарыстоўвалася не напоўніцу. Другі паверх да нядаўняга часу займаў аддзел унутраных спраў. Цяпер памяшканні вызваліліся, і мы вядзём там рамонтныя работы. Завершым іх бліжэйшым часам. Як і ў рэстаране, што мяркуем адрамантаваць з адначасовым уводам кафэ. Хутка запрацуе і прыватная страўня з гасцінічнымі нумарамі на ўездзе ў Расоны. Вельмі спадзяёмся на фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам, які распачне сваю працу напрыканцы бягучага года.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Раённы Цэнтр культуры сёння — таксама ў рыштаваннях. А туды, пагадзіцеся, маглі б завітваць шматлікія турысты для прагляду разнастайных канцэртных праграм. На жаль, няма пакуль такой магчымасці...

Святлана ВОЛКАВА:
— РЦК на капітальным рамонце — з мінулага года. Асвоілі летась 500 мільёнаў рублёў, сёлета будзе выдаткавана яшчэ амаль мільярд. Паводле плана, увядзём РЦК у дзеянне ў 2011-м.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Чакае рамонту і яшчэ адна прывабная для турыстаў установа культуры — Дом рамёстваў. У новым будынку, што днямі перадалі РДР, як я даведаўся, ёсць праблемы з асвятленнем і ацяпленнем. Калі не вырашыць гэтыя пытанні, дык ці можна будзе казаць пра належнае функцыянаванне ўстановы?

Святлана ВОЛКАВА:
— Мы яшчэ не паспелі туды пераехаць, бо Дом рамёстваў раней займаў чатыры пакоі ў Расонскай ДШМ. На новым месцы размесцім салон-краму, этнаграфічны музей і гурток разьбы па дрэве. Як атабарымся ў гэтым будынку, дык зробім цякучы рамонт (у нас прадугледжана на гэта 30 мільёнаў рублёў). Да пачатку халадоў уходзімся.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Адсюль, напэўна, і пачнём гутарку пра заўсюдную праблему ўсіх аддзелаў культуры — продаж сувеніраў для турыстаў.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— Сапраўды, раней з продажам сувеніраў у нас былі праблемы. Але ў мінулым годзе адкрылі салон-краму, прадаём вырабы рамеснікаў у Расонах, а таксама творы традыцыйнага мастацтва. Яны карыстаюцца попытам у наведвальнікаў аграсядзіб. Гэты накірунак лічу вельмі перспектыўным.

Святлана ВОЛКАВА:
— Зарабілі з дапамогай салона-крамы летась адзін мільён дзвесце тысяч рублёў, а за чатыры месяцы гэтага года — ужо 600 тысяч. На "Заборскім фэсце" сувеніры заўсёды раскупляюцца…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— А чаму б не праводзіць своеасаблівыя "майстар-класы" для тых жа замежнікаў у аграсядзібах, дзе яны маглі б стварыць выраб з гліны ці саломкі сваімі рукамі? Іх таксама можна арганізаваць на платнай аснове. І, як сведчыць практыка іншых рэгіёнаў (згадайма тую ж Валожыншчыну), праца народных майстроў пастаянна прыцягвае ўвагу турыста, асабліва — замежнага. І яшчэ. У Дома рамёстваў ёсць два філіялы на раёне, а вось сувеніры рэалізуюцца толькі ў райцэнтры. А можна ж прадаваць творы майстроў і ў філіялах, і ў прыватных кафэ на раёне, і арганізаваць продаж у аграсядзібах…

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— У філіялах пакуль яго не плануем. А вось у іншых месцах раёна продаж сувеніраў майстроў РДР ужо наладжаны. Напрыклад, у вёсцы Юхавічы.

Святлана ВОЛКАВА:
— Распачалі гэтую працу ў лютым, ужо прадалі там сувеніраў на 300 тысяч.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Паездзіў па раёне і пабачыў, што дарогі ў вас не надта добрыя для турыстычных шпацыраў. Не да ўсіх аграсядзіб, як даведаўся, пракладзены асфальт…

Аксана ПАТАПАВА:
— Асфальт патрэбны, на маю думку, для мінчан, а вось замежнік нават задаволены, што едзе па гравійцы. Мы нават спецыяльна маршрут для замежнікаў пракладаем па неасфальтаваных дарогах, бо гэта цікавіць іншаземцаў. Ператвараем, такім чынам, свой мінус у плюс.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— Наш раён датацыйны на 60 працэнтаў, таму не ўсё ад нас залежыць. У мінулым годзе паклалі 11 кіламетраў асфальту.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Райвыканкам пайшоў па шляху развіцця агратурызму. Тры гады таму, калі "К" пісала пра Расоны, у раёне было толькі чатыры аграсядзібы. Цяпер іх — дваццаць дзве. Прагрэс — відавочны.

Аксана ПАТАПАВА:
— У нас няма гасцініц, турбаз, таму і вырашылі развіваць сетку сельскіх сядзіб. Цяпер два населеныя пункты раёна — Клясціцы і Забор'е — могуць прыняць у сваіх сядзібах да 30 чалавек.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— А як узаемадзейнічае аддзел культуры з аграсядзібамі?

Святлана ВОЛКАВА:
— Напрыклад, народны фальклорны ансамбль "Крыніца" неаднойчы сустракаў велатурыстаў, паказваў абрад "Талака". Праўда, бясплатна.

Дарэчы, адразу пасля "лятучкі" наведаўся ў Янкавіцкі СДК да ўдзельнікаў "Крыніцы". Аказалася, што калектыў не толькі на бясплатнай аснове спявае песні для заезджых турыстаў, паказвае ім разнастайныя абрады, але нават… арганізуе для прыезджых чай з салодкім сталом!

Дзіўная рэч, калі ўлічыць, што для Янкавіцкага СДК ніхто не адмяняў план платных паслуг! Адказу на пытанне, чаму так адбываецца, я так і не атрымаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Атрымліваецца, што толькі "Крыніцу" і запрашаюць уладальнікі аграсядзіб, але народных ансамбляў у раёне — тры. З іх дапамогай спектр культурных паслуг на маршрутах значна павялічваўся б. І прыкладаў таму па раёнах Беларусі шмат.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— Безумоўна, рэзерв для аддзела культуры — нявыкарыстаны. Добры калектыў ёсць у аграгарадку "Сяляўшчына" — "Спадчына". Ён, праўда, не народны, але якасна можа выканаць любую творчую праграму.

Святлана ВОЛКАВА:
— Падалі дакументы на прысваенне звання "народны" калектыву "Вечарына" з Клясціцаў. Хутка будзем рыхтаваць дакументы і на прысваенне звання яшчэ аднаму калектыву.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Але згаданыя калектывы на турыстычнай дзялянцы, на жаль, пакуль не працуюць…

Расонскі РЦК пакуль на рамонце.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:
— Што да планаў, дык у раёне з'явяцца ў гэтым годзе яшчэ два домікі паляўнічага. Два гады таму аддзел спорту і турызму адкрыў турыстычны цэнтр у вёсцы Межна: там абсталяваны шэсць спальных месцаў, да таго ж, у нас ёсць палаткі, і мы можам прапанаваць усё патрэбнае турыстычнае начынне. Па лініі ДПУ "Эка-Росы" нам засталося аформіць Цэнтр экалагічнага выхавання ў вёсцы Забор'е: там запланавана стварыць яшчэ шэсць спальных месцаў для гасцей.

Аксана ПАТАПАВА:
— А ўвогуле ў нас наступны "турпакет": пражыванне і харчаванне забяспечваюць сельскія сядзібы, а аддзел культуры аказвае шэраг забаўляльных паслуг.

Святлана ВОЛКАВА:
— Мы падрыхтавалі шэраг праграм па каляндарна-абрадавым цыкле: Каляды, Новы год, вяселле, радзіны, зажынкі, дажынкі… І на кожны ў нас распрацавана калькуляцыя: гэта нашы новыя віды платных паслуг. Калі прывозім сваім транспартам калектыў, дык гэта адна расцэнка, а калі даюць транспарт уладальнікі аграсядзіб — іншая. І гэта практыкуецца ва ўсіх 22 падобных установах.

Ала ХАРЭНЬ:
— Райвыканкамаўская ўстанова "Эка-Росы", створаная яшчэ ў 2005 годзе, ставіць сваімі задачамі захаванне і зберажэнне прыродаахоўных заказнікаў і спрыянне развіццю агра-, экатурызму ў рэгіёне. І мы цесна супрацоўнічаем у гэтым плане з аддзелам

Завальню не адшукаеш

культуры. Так, у аграсядзібах прапаноўваем нашым наведвальнікам шэраг паслуг, расказваем, што можна заказаць правядзенне абрадаў, альбо з дапамогай народнага калектыву правесці вечарыны для турыстаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Але я пабываў у двух аграсядзібах у Клясціцах, і не бачыў нідзе расцэнак на такія паслугі аддзела культуры. Трэба, як падаецца, каб у кожнай аграсядзібе знаходзіўся на бачным месцы прайс-ліст з расцэнкамі на паслугі, можа, нават асобна на турыстычныя і на культурныя. Тады і запатрабаванасць іх была б значна большая. Карацей, неабходны і патрэбны, на маю думку, рэклама і маркетынг. Бо, упэўнены, заказваюць у вас правядзенне абрадаў не так ужо і шмат чалавек. Напрыклад, наколькі запатрабаваны вясельны традыцыйны абрад на Расоншчыне?

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Зімой рабілі першую спробу — святочнае мерапрыемства "Рэзідэнцыя Дзеда Мароза". І там былі задзейнічаны культработнікі з Краснапольскага СДК. Школьнікі плацілі па 15 тысяч, але ахвотна туды ехалі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Гэта ўсё, канешне ж, добра. Але рэзідэнцыі Дзеда Мароза існуюць ужо на Гомельшчыне і на Брэстчыне. Навошта вам "за вушы прыцягнутае", калі свайго цікавага матэрыялу хапае?

Святлана ВОЛКАВА:

— Там былі казачныя персанажы, дзяцей чакаў салодкі стол. Зарабілі такім чынам каля мільёна рублёў. Але гэта першая спроба. Наступным разам, упэўнена, заробім больш…

Або вось яшчэ адзін прыклад новай паслугі: спектакль, што ладзім для экскурсантаў у Музеі партызанскага побыту. І каштуе гэтая паслуга нямала: 256 тысяч рублёў. У гэтым мерапрыемстве — 70 удзельнікаў!

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Але пра гэта "К" пісала яшчэ тры гады таму. Упэўнены, цяпер названы музейны маршрут не так запатрабаваны: усе школьнікі і ўвогуле жыхары райцэнтра там, пэўна, ужо пабывалі.

Святлана ВОЛКАВА:

— Так, раней шмат ездзілі, цяпер ужо — не надта ахвотна. У 2007 — 2008 гадах паслуга была надзвычай запатрабаванай.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Дык трэба прапаноўваць новыя тэатралізацыі, адкрываць новыя маршруты.

Святлана ВОЛКАВА:

— Адкрылі ў мінулым годзе музейны маршрут у вёску Межна: там у нас ёсць экспазіцыя ад Музея баявой садружнасці.

Падумалася: калі людзі менш пачалі ездзіць у партызанскі музей пад адкрытым небам, дык культработнікам варта рабіць тыя ж тэатралізацыі і ў Межне, і ў аграсядзібах. Ладзіць арыгінальныя мерапрыемствы, пра якія турысты будуць доўга згадваць: арганізаваць там выстаўку зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны, фатаграфаваць турыстаў у вайсковай форме, даць ім патрымаць той жа ППШ у руках, пусціць чаўны або плыты з турыстамі па партызанскім возеры, прадаставіць магчымасць пажыць у зямлянцы… Нагадаем, пра сапраўдныя "рэцэпты партызанскага выжывання" часоў Вялікай Айчыннай вайны мы распавялі ў мінулым нумары.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Трэба, каб аддзел культуры больш працаваў над рэкламай сваіх паслуг, раскручваў новыя маршруты…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Яшчэ раз згадаю пра рэкламу. Пад час паездкі па раёне не бачыў ніводнага ўказальніка да тых аб'ектаў, якія цікавыя турыстам, няма і знаку таго, што ёсць столькі аграсядзіб…

Ала ХАРЭНЬ:

— Рэкламы — малавата. Спадзяюся, паступова зробім, каб да кожнай аграсядзібы ў нас з'явіўся ўказальнік.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Асноўная наша рэклама ідзе праз Інтэрнет, бо менавіта яна найбольш дзейсная. Рэкламуем сябе ў абласных і раённых газетах, выдаём буклеты на чатырох мовах штогод, выпусцілі прэзентацыйны дыск. Ды і на ўездзе ў раён і ў саміх Расонах у нас стаяць бігборды, дзе ёсць інфармацыя і пра сядзібы, і пра музеі, а таксама змешчаны кантактныя тэлефоны. Хутка паставім яшчэ чатыры падобныя бігборды.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Турыстычныя буклеты можна рабіць і ў цэнтральнай бібліятэцы горада. У іншых раёнах распаўсюджана наступная практыка: праводзіць краязнаўчыя чытанні, піарыць свой край усімі магчымымі сродкамі…

Аксана ПАТАПАВА:

— Буклеты нам рабіла Нацыянальнае агенцтва па турызме, а дыскі мы самі рыхтавалі. І разыходзіцца ўся гэтая рэкламная прадукцыя вельмі добра.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Яшчэ адна праблема, якую не магу абмінуць: як падаецца, слаба наладжана работа па "раскрутцы" знакамітых імёнаў вашага раёна. Да прыкладу, таго ж Яна Баршчэўскага. Няма нічога складанага ў тым, каб абсталяваць хатку каля Нешчарды, зрабіць там невялічкую гасцініцу. Можна праводзіць анімацыйныя мерапрыемствы, як робяць гэта на Ашмяншчыне… І ў тым — яшчэ адзін рэзерв для аддзела культуры. Трэба толькі падключыць да справы метадыстаў раённага метадычнага цэнтра. Вось гэта быў бы крэатыў!

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Усё так! Сёлета ўвялі тры новыя турыстычныя маршруты, куды ўвайшлі і мясціны, звязаныя з Янам Баршчэўскім. У Мурагах, дзе нарадзіўся пісьменнік, стаіць помнік у яго гонар, ёсць музейная экспазіцыя ў сельскай бібліятэцы вёскі Гарбачэва…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— У вас, да таго ж, — два заказнікі на тэрыторыі раёна, дзе мноства лекавых раслін, прычым вельмі рэдкіх. Чаму б не стварыць, як у Іванаўскім раёне ў вёсцы Стрэльна, Музей народнай медыцыны? Збіраць зёлкі, прадаваць розныя зборы, частаваць гарбатай заезджых турыстаў…

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Мы, канешне, пра гэта думалі, і пачалі па школах рабіць фітабары, дзе прапануюць такія чаі. Будзем ствараць іх і ва ўстановах культуры.

Аксана ПАТАПАВА:

— Сапраўды, замежнікі цяпер, кажучы па-добраму, "завернуты" на экалогіі. Памятаю, прыязджалі да нас немцы, спыніліся мы ў лесе, яны там знайшлі коніка ў траве — дык мы потым цягам паўгадзіны не маглі "ўсадзіць" іх у аўтобус…

Зёлкавую гарбату мне прапанавалі ў адной з аграсядзіб раёна, паказалі нават невялікую хатку, дзе створаны Музей траў. У прыватнікаў тут ужо ёсць сушылка і травярэзка… Калі па шчырасці, дык мяркую, што прыватнік павінен пазычаць ідэі ў культасветніка, а не наадварот…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Уладзімір Шаляговіч, начальнік аддзела культуры Іванаўскага раёна, распавядаў мне, што ў Стрэльне, побач з Музеем народнай медыцыны, плануецца пабудова невялікага кафэ, якое будзе прапаноўваць традыцыйныя беларускія стравы і, натуральна, лекавую гарбату для турыстаў. Хоць у самім музеі ўжо цяпер можна пакаштаваць раслінны збор і адпачыць пад водар лекавых траў. Таму і на Расоншчыне, калі ўжо ствараць падобныя турыстычна-культурныя аб'екты, трэба, як сведчыць вопыт, дбаць і пра належную інфраструктуру.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Ёсць у нас задумка зрабіць на возеры Нешчарда нешта накшталт невялікай гасцініцы. Але ўсё ўпіраецца ў грошы. Або вось яшчэ такі план: стварыць этнаграфічную вёску ў якасці турыстычнага маршруту. Мы ўжо і месца падшукалі — вёска Роўнае Поле: там шмат кінутых дамоў і жывуць толькі некалькі чалавек, пенсіянераў. А там жа побач — партызанскі музей пад адкрытым небам. Трэба шукаць спонсараў пад гэты праект. У ім, натуральна, будзе задзейнічана і культура, і народныя ансамблі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— У Петрыкаўскім раёне знайшлі стары цеплаход — збіраюцца яго рамантаваць і катаць на ім турыстаў. Тое ж самае — у Івацэвіцкім раёне, на Выганаўскім возеры. У некаторых раёнах працуюць турыстычныя паромы.

Аксана ПАТАПАВА:

— А мы водныя туры ладзім на байдарках.

Галіна ПАДВІЦЕЛЬСКАЯ:

— Увогуле, пагаджаюся, што аддзелу культуры трэба працаваць у напрамку пашырэння новых відаў паслуг. Я лічу, што перспектывы для развіцця турызму ў нашым раёне ёсць. Першапачатковае станаўленне мы ўжо прайшлі, база ёсць, трэба развіваць дзейнасць усіх аддзелаў па ўдасканаленні працы ў турыстычнай сферы і даваць канкрэтныя вынікі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Расонскі раён — Мінск
Фота аўтара

Пад час райвыканкамаўскай "лятучкі": Святлана Волкава, Аксана Патапава, Галіна Падвіцельская, Ала Харэнь.

Дэталь да агульнай карціны

У Еўропе слухаюць "Крыніцу"

У вёсцы Янкавічы пры мясцовым СДК арганізаваны народны фальклорны ансамбль "Крыніца". Узначальвае яго цягам ужо больш як трыццаці гадоў Надзея Кавалёва.

Так народны фальклорны ансамбль "Крыніца" Янкавіцкага СДК сустракае турыстаў.

Калектыў, які складаецца з 14 чалавек, з'яўляецца актыўным удзельнікам раённых, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў, па запрашэннях прыватных уладальнікаў аграсядзіб выступае са сваімі разнастайнымі праграмамі. Праўда, плату за свае выступленні "крыніцаўцы" маюць невялікую: білет каштуе ўсяго тысячу рублёў. Ды, як прызналася мне кіраўніца ансамбля, неяк не прызвычаіліся яны яшчэ да таго, каб браць грошы за свае спевы.

— Будзем пашыраць платныя канцэрты, — казала мне Надзея Кавалёва, — але неяк саромеемся патрабаваць плату за свае выступленні.

Але ці варта саромецца? Калектыў спявае настолькі яскрава і захапляльна, што ногі самі просяцца ў скокі. Варта, на маю думку, займаць тую нішу ў сферы турыстычнага абслугоўвання, якая яшчэ не занята ні прыватнікамі, ні іншымі ансамблямі раёна.

Праблемы ў "Крыніцы" — навідавоку: дрэнны баян, не стае яшчэ аднаго камплекта касцюмаў з лёну. На жаль, фінансавыя магчымасці аддзела культуры не могуць задаволіць усе патрэбы ансамбля.

Але хутка фінансавае становішча палепшыцца. Нядаўна "Крыніца" ўдзельнічала ў сумесным праекце Праграмы развіцця ААН (ПРААН) і Еўрапейскага саюза "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні". Узровень падрыхтоўкі спевакоў з Расоншчыны высока ацанілі ў Еўропе: калектыў атрымаў малы грант за актыўны ўдзел у развіцці агратурызму ў раёне.

На гэтыя грошы калектыў плануе набыць баян і новыя касцюмы, а таксама аб'ехаць увесь раён, каб сабраць фальклор для пашырэння рэпертуару.

Стратэгія развіцця для рэгіёна

Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў правёў чарговы Рэспубліканскі семінар-практыкум для начальнікаў раённых аддзелаў культуры, дырэктараў раённых метадычных цэнтраў народнай творчасці, кіраўнікоў СДК і сельскіх клубаў, новых спецыялізаваных варыятыўных і інтэграваных устаноў культуры. Гэтым разам семінар быў прысвечаны асаблівасцям дзейнасці сельскіх устаноў культуры ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах.

Адкрыла семінар-практыкум намеснік дырэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Ванда Дуброва. Яна пазнаёміла ўдзельнікаў семінара з новымі кірункамі і прапановамі па формах перападрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы. Намеснік начальніка аддзела інавацыйных тэхналогій у сацыякультурнай дзейнасці ІПКПК Лілія Жмачынская адзначыла, што праблематыка, якой прысвечаны семінар-практыкум, разглядалася на канферэнцыях і іншых сустрэчах з практыкамі неаднаразова, але ў такім разгорнутым фармаце сітуацыя аналізуецца ўпершыню.

Тон рабоце семінара задало цікавае і ёмістае выступленне дацэнта кафедры дзяржаўнага будаўніцтва Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Віктара Ярмоленкава. Выступоўца распавёў прысутным пра нашу краіну ў кантэксце пераходу да ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Вывераны баланс "прырода — грамадства", рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў, прадуманае нарошчванне вытворчасці і абавязак перад будучымі пакаленнямі аб захаванні духоўных каштоўнасцей — менавіта на гэтых "кітах" і трымаецца перспектыўная ўстойлівасць нашага развіцця. Немалаважная роля тут належыць аддзелам культуры. Да прыкладу, першая такая стратэгія для сельскай тэрыторыі была распрацавана ў свой час для горада Дзісна Міёрскага раёна. Гэткая ж канцэпцыя рыхтуецца і для Лепельскага рэгіёна.

Кожнае мястэчка павінна мець брэнд, прыродны або гісторыка-культурны аб'ект, вакол якога наладжваецца культурная работа, развіваецца эка- і агратурызм. Дарэчы, пра абавязковую анімацыйнасць такіх брэндавых аб'ектаў з актыўным удзелам мясцовых аддзелаў культуры "К" піша далёка не першы год.

Па меркаванні дацэнта кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Івана Крука, уся беларуская сакральная "геаграфія" — святыя мясціны, капішчы, гаючыя крыніцы і асобныя валуны — таксама павінна стаць эпіцэнтрам брэндавых творчых намаганняў нашых работнікаў культуры. Такая еднасць з прыродай і гісторыяй Беларусі апрача духоўных набыткаў прынясе і грашовыя дывідэнды.

Пра формы працы ўстаноў культуры па экалагічным выхаванні насельніцтва гаварыла прафесар кафедры педагогікі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ Надзея Самерсава. А начальнікі аддзелаў культуры Любанскага райвыканкама Васіль Каткавец і Глыбоцкага райвыканкама Рыма Муравей падзяліліся з прысутнымі вопытам работы клубных і бібліятэчных устаноў.

Удзельнікі семінара-практыкума атрымалі на электронных носьбітах нарматыўна-прававыя дакументы па метадычным суправаджэнні працы ўстаноў культуры і аматарскіх калектываў, прыкладныя палажэнні аб стварэнні новых варыятыўных і інтэграваных тыпаў і мадэлей устаноў клубнага тыпу, лепшыя сцэнарыі клубных мерапрыемстваў і сцэнарна-метадычныя матэрыялы па арганізацыі работы з рознымі катэгорыямі сельскага насельніцтва. Удзельнікам семінара былі раздадзены пакеты прафесійнай і сцэнарна-метадычнай літаратуры.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

Пра "дарослых дзяцей"

Акцёры і рэжысёры дзесяці школьных тэатраў з Віцебска сабраліся ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа. Тут прайшлі традыцыйныя школьныя сцэнічныя чытанні.

У гэтым годзе "Школьны тэатр" праходзіў чатырнаццаты раз. На Малой сцэне тэатра прафесійнае журы з мастацтвазнаўцаў, акцёраў, журналістаў, прадстаўнікоў аддзела адукацыі, якое ўзначаліў мастацкі кіраўнік Коласаўскага тэатра Рыд Таліпаў, прагледзела дзесяць конкурсных і дзве пазаконкурсныя работы. Згодна з Палажэннем, трапіць на конкурс могуць толькі спектаклі паводле п'ес беларускіх драматургаў, але шанц паказацца журы і гледачам маюць і лепшыя калектывы, што працуюць з замежнымі аўтарамі.

На "Школьным тэатры-14" былі прадстаўлены інсцэніроўкі твораў, п'есы і ўрыўкі з п'ес Д.Балыка, У.Бутрамеева, А.Дыбчы, К.Губарэвіча, С.Кавалёва, У.Караткевіча, А.Паповай, Л.Родзевіча і пастаноўкі маладых аўтараў. Асобным блокам з трох спектакляў была "агучана" тэма 65-годдзя Вялікай Перамогі. Маладзёжныя праблемы ўзнімаліся ў спектаклях "Белы анёл з чорнымі крыламі" Д.Балыка ў аўтарскай рабоце "Лялечны тэатр" Вікторыі Сурковай. Беларуская класіка пераасэнсоўвалася ў інсцэніроўцы апавядання У.Караткевіча "Паляшук".

Гран-пры Чытанняў журы аднагалосна прысудзіла спектаклю "Пясчаны замак" па п'есе С.Кавалёва, якую прадставіла на конкурс узорная тэатральная студыя "Дарослыя дзеці" гімназіі № 8 (кіраўнік і рэжысёр — А.Раманава). "Дарослыя дзеці" паказалі спектакль, што можна аналізаваць, разважаць пра яго ансамблевасць, сцэнаграфію, праз якую нечакана раскрываецца тэма імгненнасці і нетрываласці ўсяго, што зроблена чалавекам. Нагадаем, п'есу "Пясчаны замак" наша газета друкавала ў "Куфры-радцы".

Ці варта ж будаваць пясчаныя замкі? Школьны тэатр, па сутнасці, — пясчаны замак. Пастаноўка, што ствараюць цягам некалькіх месяцаў, паказваецца максімум тры разы, акцёрскія склады штогод змяняюцца, і рэжысёры, якія толькі-толькі нечага дамагліся, вымушаны пачынаць усё наноў. Але тое, што Чытанні праводзяцца чатырнаццаты раз, сведчыць, што гэтыя замкі-спектаклі — патрэбныя.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ
Віцебск

Дзіцячаму тэатру "Вясёлка" Палаца культуры горада Барань — 10 гадоў. У калектыве — 25 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце 7 — 16 гадоў. У 2004-м "Вясёлка" стала дыпламантам гарадскога фестывалю "Тэатральная вясна", а праз год тэатр атрымаў званне ўзорнага.

Калектыў тэатра "Вясёлка".

Кніжкі з... грузавічка

Пад час абласнога месячніка "Бібліятэка — шлях у будучыню" Бярозаўская ЦБС правяла ў Кабакоўскай сельскай бібліятэцы семінар. Яго тэма — "Аграгарадоцкая бібліятэка ў дапамогу інфармацыйнай падтрымцы навучальнага працэсу".

Сёння ў раёне інфармацыйна-дасугавым абслугоўваннем насельніцтва аграгарадкоў займаюцца 13 бібліятэк, з якіх 6 камп'ютэрызаваны. Паслугамі Кабакоўскай бібліятэкі карыстаюцца 450 чытачоў, з іх 120 — дзеці. Кніжны фонд у 18 тысяч экземпляраў задавальняе чытацкі попыт студэнтаў, спецыялістаў і рабочых аграпрамысловага комплексу, пенсіянераў з аграгарадка "Кабакоўскі".

Работнікі ЦБС прыехалі да калегі — бібліятэкара Раісы Неліповіч для таго, каб пераняць яе вопыт работы па супрацоўніцтве са школай. Далучэнне моладзі да чытання — галоўны прыярытэт установы. Кнігалюбы малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту маюць маляўнічы куток для чытання, а скрынка з літаратурай імітуе драўляны міні-грузавічок.

Каб навучэнцы атрымлівалі якасныя веды, у бібліятэцы дзейнічаюць выстаўкі, тэматычныя паліцы "Кнігі-старажылы", "Новыя кнігі? Мне!", "Мы — за здаровы лад жыцця. А ты?", "Гэтыя кнігі ведаюць усё", "Рознакаляровая зямля Беларусі".

Цягам навучальнага года бібліятэкар праводзіць гутаркі, бібліятэчныя ўрокі. У краязнаўчым кутку бібліятэкі "Я гэты край Радзімаю заву" змешчаны разнастайны матэрыял па гісторыі раёна, вёсак, эканоміцы і сацыяльным жыцці, аб знакамітых земляках, ветэранах Вялікай Айчыннай вайны і старажылах.

На жаль, вясковыя бібліятэкі не могуць пахваліцца стабільным папаўненнем фонду літаратурай па сельскай гаспадарцы, педагогіцы, медыцыне. Бібліятэкі аграгарадкоў камплектуюцца значна лепш. Бібліятэкар Раіса Неліповіч прапанавала ўвазе сваіх калег такія кнігі.

Кабакоўская бібліятэка імкнецца далучаць да сістэмнага прафесійнага чытання вясковых настаўнікаў. Апошнія творча супрацоўнічаюць з установай. Для ўдзельнікаў семінара маладыя настаўніцы Раіса Мелех, Іна Неліповіч падрыхтавалі прэзентацыю краязнаўчага відэароліка "Куточак роднай зямлі", а таксама праілюстравалі мультымедыяматэрыялам тэатралізаванае літаратурна-экалагічнае свята кнігі "Усе фарбы нашай зямлі".

Дырэктар ЦБС Ірына Макарэвіч адзначыла граматай самы чытаючы клас. Работнікі аддзела бібліятэчнага маркетынгу рэкамендавалі бібліятэкарам метадычныя навінкі па папулярызацыі галіновай літаратуры. А з рук старшыні Першамайскага сельвыканкама Валерыя Шупеніка ўстанова атрымала ксеракс.

Ала ДРАГАН,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦБС
На здымку: у Кабакоўскай сельскай бібліятэцы.

База абнаўлення

Летась у Полацку ладзіўся Абласны фестываль аматарскіх тэатраў. Сярод узорных калектываў "Вясёлка" заняла на Віцебшчыне другое месца. Сёлета ў жыцці юных артыстаў адбылася чарговая яркая падзея: з прэм'ерным спектаклем "Янка — сялянскі сын" паводле беларускіх народных казак "Вясёлка" выступіла на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску.

Артысты ўзорнага тэатра з Барані сёлета бралі ўдзел у традыцыйным "Школьным тэатры". Выступленне нашых артыстаў было высока ацэнена. А ў маі мы мяркуем паказаць свае спектаклі на сцэнічных пляцоўках Оршы і Дуброўна.

Наладжванне выязных платных спектакляў дае дадатковую магчымасць для развіцця нашай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Такім чынам абнаўляем і дэкарацыі, і касцюмы.

Людміла САСНІЦКАЯ,
рэжысёр узорнага тэатра "Вясёлка" Палаца культуры г. Барань

Семінар распачалі творцы

Сустрэчай з творчымі людзьмі і калектывамі раёна пачаўся чарговы семінар работнікаў клубных устаноў, які адбыўся ў Столінскім гарадскім доме культуры.

Галоўнымі героямі сустрэчы сталі народны майстар, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны дзеячам культуры і мастацтва Іван Супрунчык, які працуе ў этнаграфічным музеі ў вёсцы Цераблічы; выкладчык мастацкага аддзялення Рэчыцкай школы мастацтваў, стыпендыят спецыяльнага фонду Кіраўніка дзяржавы па падтрымцы таленавітай моладзі Сяргей Місюн, а таксама кіраўнік народнага хору ветэранаў вайны і працы Столінскага ГДК Дзіна Бажко…

Іван Супрунчык працуе толькі сякерай. У ГДК была афармлена выстаўка работ майстра "Адвечная прыгажосць дрэва".

Сяргей Місюн удасканальваў здольнасці ў Мінскім мастацкім вучылішчы, працаваў над афармленнем фасада Нацыянальнай бібліятэкі. Прафесійныя здольнасці таленавітага мастака ацэнены і на Століншчыне: ён стаў лаўрэатам раённага конкурсу "Малады чалавек 2008 года" ў галіне культуры, пераможцам Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў "Зорка ўзышла над Беларуссю" ў намінацыі "Графіка. Жывапіс".

Пра творчую актыўнасць Дзіны Бажко "К" пісала ўжо. Хор ветэранаў выканаў шэраг патрыятычных песень. У іх ліку — "Столінскі край", што стаў гімнам раёна (словы самадзейнага паэта, кампазітара і мастака Паўла Куліка з Церабяжова).

А потым пачалася тэарэтычная частка семінара: "Патрыятычнае выхаванне насельніцтва сродкамі культурнага баўлення часу".

Галіна ГАШЧУК
Столін
На здымку: Сяргей Місюн.

25 550 дзён… Наколькі вялікая гэтая лічба? Напярэдадні свайго юбілею арыфметыкай заняўся знакаміты пісьменнік, старшыня Праўлення Беларускага дзіцячага фонду, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" Уладзімір Ліпскі. Ён падлічыў: 25 550 дзён — гэта акурат 70 гадоў.

Са значнай вяхой жыццёвага шляху павіншаваў пісьменніка і грамадскага дзеяча Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Пра гэта паведаміла Прэс-служба Кіраўніка дзяржавы. "Вас паважаюць за актыўную грамадзянскую пазіцыю і шматгадовую работу на пасадзе старшыні Праўлення Беларускага дзіцячага фонду, дзякуючы якой змяніліся да лепшага лёсы многіх маленькіх грамадзян нашай краіны, — адзначаецца, у прыватнасці, у віншаванні. — Напісаныя Вамі кнігі падабаюцца юным і дарослым чытачам, таму што яны прасякнуты любоўю да роднай зямлі і яе народа, непарыўна звязаны з гераічнай гісторыяй Беларусі, вучаць шанаваць Радзіму, быць добрымі і справядлівымі". Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру таксама невычэрпнага натхнення, творчых поспехаў, здароўя, бадзёрасці і аптымізму.

…А калі рабіўся кадр, што аздабляе артыкул, Уладзімір Сцяпанавіч падзяліўся радасцю: ягоны том пра Янку Купалу выліўся ў цэлую серыю пазнаваўчых партрэтаў класікаў. І наступнай стане кніга пра Якуба Коласа. "Таму месца здымак каля помніка Коласу — зусім не выпадковае", — усміхнуўся пісьменнік.

Тры адкрыцці "Янкавага вянка"



"Здаецца, я не абышоў ніводнай тэмы, звязанай з Янкам Купалам. Наступны том серыі — пра Якуба Коласа"

Уладзімір Ліпскі заўжды быў "сваім у краіне дзяцінства". Менавіта так ён назваў свой творчы вечар, які ўчора адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Паэтычнае і празаічнае, сур'ёзнае і жартоўнае, спеўнае і сцэнічнае слова гучала са сцэны вядучай канцэртнай установы краіны. І кожны з выступоўцаў дадаваў свой штрых да творчага партрэта Уладзіміра Сцяпанавіча.

А яшчэ адну грань свайго таленту пісьменнік сам прадставіў нядаўна: кнігай "Янкаў вянок: дзецям пра Янку Купалу". Ён не проста распавёў школьнікам пра народнага Песняра, "беларускай песні ўладара", але і апрабаваў жанр "займальнай біяграфіі для маленькіх" у айчыннай літаратурнай прасторы.

Пра гэта і распавёў Уладзімір Сцяпанавіч на нашых старонках.

Чырвоная кніга Акопаў

— Перш чым узяцца за пяро, я павінен быў глыбока ўсвядоміць, што Купала — наш геній. Ён, па сутнасці, стварыў не толькі айчынную літаратуру. Купала — адзін з найактыўнейшых стваральнікаў літаратурнай мовы. Мяне заўсёды, прызнаюся, здзіўляла гэта, бо чалавек, па сутнасці, нідзе не вучыўся, не прайшоў ні школы, ні студэнцкай праграмы ў поўным аб'ёме.

Ведаеце, аднойчы я праехаў той дарогай, па якой Купала вёз хаваць свайго бацьку ў вёску Корань на Лагойшчыне — гэта кіламетраў дваццаць ад той сядзібы, дзе сям'я на той час жыла. Я ехаў на машыне, а ён жа тады — возам. Уяўляю, колькі перажыў юнак за гэтую памінальную дарогу…

Я перачытаў увесь акадэмічны збор твораў Купалы, удумваючыся ў кожны верш: чаму ён яго напісаў, каму той прысвечаны, што за гэтым стаяла. У яго няма "пустых" вершаў, як часам у сучасных паэтаў. Я не толькі перачытаў усе ягоныя творы, але яшчэ і амаль усё, што пісалі пра творцу даследчыкі, краязнаўцы — усе ўспаміны пра Купалу. Праехаў і па многіх мясцінах, дзе ён бываў, асабліва па Лагойшчыне, сустракаўся з людзьмі.

Асабліва ўсхвалявалі мяне Акопы, а для Купалы гэтая вёсачка была, што для Пушкіна — Міхайлаўскае. Я нават даведаўся, якія травы і дрэвы з тых мясцін занесены ў Чырвоную кнігу.

Некранутая паліца

— Даўно чакае даследавання жыццяпіс спадарожніцы Купалы — Уладзіславы Францаўны. Пра яе, мне здаецца, можна напісаць цэлую кнігу. Яна прысвяціла яму жыццё, шмат дапамагала паэту. Нават такая дэталь: яна кожную раніцу гатавала на чалавек дзесяць — пятнаццаць абед. Хто з сённяшніх жонак будзе займацца гэтым? Да Купалы маглі зайсці, ён мог кагосьці запрасіць… Ён жа любіў гасцей. І потым, жонка Купалы працавала ў дзіцячым садку, прыводзіла дзяцей. Яна нават падрыхтавала некалькі зборнікаў для малых. Пра яе, паўтараю, магла б быць вельмі цікавая кніга, не маленькая. І яна павінна быць! У музеі паэта, дарэчы, — цэлая некранутая паліца перапіскі Купалы з жонкай!

Залаты сімвал

— На жаль, у творчай і жыццёвай біяграфіі Янкі Купалы ёсць і такія моманты, якія мала вядомыя даследчыкам. Жыццё паэта складвалася няпроста, драматычна, а ў самым канцы — трагічна. Да сёння ніхто не ведае, як жа ўсё здарылася ў той гасцініцы "Масква"… Магчыма, калі-небудь хтосьці зможа раскрыць гэтую таямніцу. Гэта яшчэ гісторыкі мусяць разгадаць.

Заўважу без залішняй сціпласці: хоць купалазнаўства ў нас развіта даволі шырока, тым не менш, і мне, здаецца, удалося нешта адкрыць. Вось, напрыклад, дакладнае імя маці Песняра. Яе звалі Бянігна, — напісана: Богуміла. Вельмі прыгожае імя.

Сярод іншага, я знайшоў азначэнне герба Луцэвічаў, а таксама — тлумачэнне, чаму нага воіна на ім размешчана на кароне. Аказваецца, гісторыя гэтага герба такая. Кароль польскі надаў гэты сімвал свайму воіну за тое, што той выратаваў яго двойчы: першы раз воін аддаў свайго каня каралю, а другім разам яны абодва былі паланёны, закаваны ў драўляныя калодкі, і воін адсёк сабе нагу, каб выратаваць свайго правадыра. Таму на версе гэтага сімвала залатая нага — як сімвал вернасці. Луцэвічы нездарма абралі сабе такі герб: ён найлепшым чынам характарызуе іхні род — няскораных, чыстых, адданых сваёй зямлі людзей.

Невядомы Навагрудак

— Урэшце, Купалу можна адкрываць і адкрываць. Ну, вось я пісаў пра Навагрудак, і даведаўся, што нейкі час Купала быў на гэтай зямлі. Я не ўнікаў у дэталі, як пісьменнік трапіў туды, але нейкі час ён усё ж там жыў і працаваў. Напісаў там два вершы: "З кірмашу" і "Пра світанне". І вось так, даследуючы, праходзіш па ўсім жыцці паэта: дзе ён напісаў верш, што яго натхніла. Яшчэ можна напісаць цэлы цыкл "Дзяцям пра Янку Купалу". Хай мая кніга будзе пачаткам у купалазнаўстве для дзяцей, для юнацтва.

Занатавала Марыя АКУЛІК,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Тым часам

…і "Кватэрнік у дзядзькі Якуба"

У рамках акцыі, прымеркаванай да Міжнароднага дня музеяў, адбудзецца адразу некалькі запамінальных падзей на пляцоўках Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Пасляваенная сядзіба народнага паэта Беларусі ўяўляла з сябе своеасаблівы аазіс у цэнтры Мінска. Ці не кожная раслінка на Коласавым падворку мела сэнс — ад блакітнавокіх незабудак да жыццястромкіх соснаў. Асаблівае ж месца займала кампазіцыя з чатырох дубоў і бярозы — дрэў, якія сімвалізавалі членаў сям'і вялікага Песняра: жонку, сыноў і яго самога.

Але старэюць і хварэюць кучаравыя хвоі. Не вытрымала бязлітаснага цячэння часу і бярэзінка. Яе, зусім кволую, гадаваў сам Якуб Колас. Ды колькі гадоў таму сціхла ейнае шапаценне: бяроза ссохлася, і дрэва вымушаны былі прыбраць.

15 мая, а 18-й гадзіне, у рамках "Ночы музеяў" у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа пройдзе сімвалічная акцыя "Няхай квітнее дрэва дружбы!" з аднаўленнем кампазіцыі з чатырох дубоў і бярозы. На ўрачыстае дзейства запрашаюцца паслы краін, якія так ці інакш звязаны з лёсам вялікага сына беларускай зямлі: Украіны, Расіі, Польшчы, Літвы, Францыі… Сумесная пасадка дрэва прадстаўнікамі пасольстваў паклікана сімвалізаваць сяброўства паміж народамі, узаемасувязь іх культур, значнасць асобы Якуба Коласа ў справе захавання міру.

А сярод багатай на сюрпрызы праграмы музейных мерапрыемстваў своеасаблівае месца зойме новая форма работы ўстановы — "Кватэрнік у дзядзькі Якуба" з удзелам маладых паэтаў і музыкантаў.

Гучала ўпершыню

У рамках сацыяльна-культурнага праекта "Чалавек нараджаецца, каб жыць…" у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыўся вечар памяці "Вайна ў лёсе пісьменніка", прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага.

Да гэтай даты створана літаратурна-дакументальная выстаўка аднаго дня, прысвечаная жыццю і творчасці пісьменніка. Сярод экспанатаў вылучаюцца ліст Кузьмы Чорнага, адрасаваны Кандрату Крапіве і Міхасю Лынькову (1941 г.), а таксама фотаздымкі, кнігі з дарчымі надпісамі, асабістыя рэчы.

Спецыяльна для імпрэзы музей адрамантаваў піяніна, якое знаходзілася ў сям'і пісьменніка і на якім браў акорды сам творца, бо меў добры музычны слых. І менавіта на гэтым мерапрыемстве яно гучала ўпершыню ў сценах установы.

Вядомы беларускі паэт, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, франтавік, Мікола Аўрамчык непасрэдна быў знаёмы з Кузьмой Чорным. Мікалай Якаўлевіч чула і пранікнёна, вельмі падрабязна, распавёў пра свае сустрэчы з пісьменнікам.

Надзея ЯШКІНА,
старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

Віленскія вобразы

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы працуе выстаўка "Віленскія вобразы".

На ёй экспануюцца работы С.Геруса, М.Селешчука, Б.Малкіна, У.Масленікава, Л.Рана і іншых.

Некаторыя з удзельнікаў выстаўкі вучыліся ў Вільнюсе, сталіцы Літоўскай ССР. Дакументам той эпохі з'яўляецца, да прыкладу, серыя літаграфій і малюнкаў Сямёна Геруса, вядомага беларускага графіка, выпускніка Дзяржаўнага мастацкага інстытута Літоўскай ССР.

На выстаўцы, сярод іншых, таксама прадстаўлена работа маладой мастачкі, нашчадка роду Луцэвічаў — Н.Табушавай.

У адказ на "Альтэр"

У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" працуе выстаўка, удзел у якой бяруць польскі жывапісец Кшыштаф Рапса і наш зямляк Аляксей Богустаў, які таксама прадставіў работы сваіх студэнтаў з кафедры выяўленчага мастацтва Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

Выстаўка праводзіцца ў адказ на экспазіцыю твораў Кшыштафа Рапса і Аляксея Богустава, што прайшла ў жніўні мінулага года ў галерэі "Альтэр" польскага горада Кашалін.

К.Рапса працуе ў накірунку сучаснага еўрапейскага жывапісу, дзе галоўнымі выяўленчымі сродкамі з'яўляюцца колер і экспрэсія. А.Богустаў, прафесар кафедры выяўленчага мастацтва ГрДУ імя Янкі Купалы, прадстаўляе жывапісныя і графічныя работы, якія грунтуюцца на рэалістычнай традыцыі і прываблiваюць гледача задуменна-паэтычнымі вобразамі беларускай прыроды.

"Галоўная ідэя выстаўкі, — адзначае дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" Дзяніс Барсукоў, — спалучэнне ў адной экспазіцыйнай прасторы работ двух мастакоў-жывапісцаў, прадстаўнікоў розных краін і мастацкіх школ, чыя творчасць радыкальна адрозніваецца".

Турыстычная вядомасць вёскі Сынкавічы, што ў Зэльвенскім раёне Гродзеншчыны, найперш звязана са старадаўняй царквой Архангела Міхаіла XVI ст., якая спалучыла найбольш выразныя рысы заходнееўрапейскага і візантыйскага дойлідства і з'яўляецца адным з нешматлікіх прыкладаў абарончага храма. Да таго ж, стылёвыя асаблівасці раманскай архітэктуры, эпохі готыкі і нават элементаў рэнесансу былі пераасэнсаваны будаўнікамі ў адпаведнасці з традыцыямі беларускага дойлідства.

Імперыялы з Сынкавічаў

Таямніцы дзесяці курганоў

Існуе легенда, нібы Сынкавіцкую царкву заснаваў вялікі князь Вітаўт у знак удзячнасці за тое, што ў мясцовых пушчах ён уратаваўся ад пагоні Ягайлы. У той жа час, паводле звестак гісторыкаў, гэты храм паўстаў на пачатку XVI ст., і што вельмі верагодна, на грошы гетмана Канстанціна Астрожскага.

Мала хто ведае пра яшчэ адну адметнасць ваколіц гэтай вёскі — шматлікія курганы. Іх даследаваннем яшчэ ў XIX ст. займаўся вядомы

археолаг Фёдар Пакроўскі, які хоць і нарадзіўся ў Кастрамской вобласці Расіі, але сваю дзейнасць прысвяціў менавіта нашаму краю: выкладаў у Мінскім духоўным вучылішчы, а ў 1884 — 1902 гг. быў захавальнікам знакамітага Віленскага музея старажытнасцей, склаў апісанне яго фондаў.

Па выніках раскопак вучоны склаў археалагічныя карты Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў, за што быў узнагароджаны Вялікім сярэбраным медалём Рускага археалагічнага таварыства.

Яго намаганнямі ў 1895 г. у Вільні з друку выходзіць кніга "Археалагічная карта Гродзенскай губерні", якая дазваляе сёння даведацца пра страчаныя або маладаследаваныя скарбы нашага народа. Паводле даных Ф.Пакроўскага, каля вёскі Сынкавічы тагачаснага Слонімскага павета налічвалася некалькі дзесяткаў курганоў — пахаванняў глыбокай старажытнасці. У прыватнасці, усяго за паўверсты на паўночны ўсход ад царквы, ва ўрочышчы Дубова, напрыканцы XIX ст. яшчэ знаходзіліся чатыры курганы. Адзін з іх, авальнай формы, меў у акружнасці 20 сажняў. Сярод іншых пахавальных насыпаў вылучаліся курганы ў форме ўсечанага конуса з упадзінамі на версе, а таксама прадаўгаватага чатырохкутніка.

У гэтым жа накірунку, але трохі далей ад папярэдніх курганоў — метраў на 500, — ва ўрочышчы Кашчэеў вучоны вызначыў і іншую групу. Гэтыя курганы размешчаны па схіле ідучых уздоўж ракі Бярозы ўзгоркаў. Большасць з іх была ўжо на той час ці то знішчана, ці то пашкоджана пасевамі. Па звестках Пакроўскага, ацалела ўсяго толькі дзесяць курганоў. Адзін з іх, авальны, меў у акружнасці 23 сажняў, а на яго версе захаваліся два невялікія паглыбленні і тры камені. Як адзначыў вучоны ў сваёй кнізе, пад час сяўбы на палетках, што знаходзіліся на гэтых курганах, сялянам часта трапляліся чалавечыя астанкі, а аднойчы нават быў знойдзены скураны бот, у якім змяшчаўся складны жалезны нож.

За некалькі вёрстаў на поўнач ад Сынкавічаў Пакроўскі налічыў да 30 курганоў рознай формы, паверхня якіх была выкладзена камянямі. На гэтым жа месцы вучоны выявіў столькі ж каменных пліт. На адной з іх адлюстраваны крыж, а таксама размешчаны два абчасаныя каменныя крыжы.

У 1887 г. ва ўрочышчы Кашчэеў сялянамі быў знойдзены каменны малаток са свідравінай і яшчэ дзве аналагічныя знаходкі на палях непадалёк. Цікавы факт падмеціў археолаг. Аказваецца, каменныя сякеры мясцовыя жыхары лічылі за стрэлы Перуна і сцвярджалі, што тыя з'яўляюцца на паверхні зямлі толькі праз 12 гадоў пасля ўдару маланкі, пад час якой яны ўтварыліся і пагрузіліся ў зямлю. І што зусім падаецца неверагодным — гэтыя стрэлы ў форме парашку ўжываліся сялянамі ў якасці лекаў супраць болю ў жываце.

У 1889 г. на дне возера ў гэтым жа ўрочышчы селянінам па прозвішчы Сяхно была знойдзена металічная сякерка. Яшчэ больш пашанцавала іншаму мясцоваму жыхару, які ў 1880 г. пры апрацоўцы свайго агарода знайшоў чыгун з залатымі і сярэбранымі манетамі, сярод якіх былі імперыялы і паўімперыялы.

Пакроўскі адзначаў, што ў дадзенай мясцовасці былі не рэдкімі таксама выпадкі знаходак на палях французскіх, польскіх, шведскіх і рускіх манет XV — XVIII стст. Да таго ж, у народзе захоўвалася легенда пра існаванне скарбу пад адной з вежаў Сынкавіцкай царквы. І хоць яна так і не пацвердзілася, але ў 1889 г. пад час рамонту храма быў выяўлены склеп са шматлікімі чалавечымі астанкамі, а таксама знойдзена відавочна старадаўняя ікона — "Пацалунак Іуды".

Для тых, хто пабываў у Сынкавічах, можа падацца дзіўным, чаму ў такую грунтоўную кнігу вядомага археолага не быў уключаны яшчэ адзін цікавы аб'ект — вінакурня. Але, як ні дзіўна, яна была пабудавана толькі на пачатку XX ст. і не ўяўляла з сябе асаблівай гістарычнай каштоўнасці. Сёння ж муры колішняй вінакурні, што надзвычай добра захаваліся, таксама як і некаторае абсталяванне ўнутры будынка, не могуць не заінтрыгаваць цікаўных турыстаў. На жаль, пакуль у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь не ўключаны ні старажытныя курганныя могільнікі, ні вінакурня, якой ужо больш за сто гадоў.

К.А.

На здымках: будынак колішняй вінакурні; царква Архангела Міхаіла ў Сынкавічах.

Праз 150 гадоў

Адным з галоўных сімвалаў духоўнай мужнасці нашага народа ўжо не адно стагоддзе лічыцца святая Сафія Слуцкая — апошняя прадстаўніца старажытнага шляхецкага роду Алелькавічаў.

Гэтай дабрачыннай і рашучай князёўне, кананізаванай Праваслаўнай Царквой, быў прысвечаны шэраг мастацкіх твораў, у тым ліку такіх знакамітых пісьменнікаў, як Юзэф Крашэўскі і Уладзіслаў Сыракомля. У цэнтры іх сюжэтаў — драматычная гісторыя шлюбу Сафіі Слуцкай і Януша Радзівіла, якому з-за сваркі з апекунамі нявесты князямі Хадкевічамі напярэдадні вяселля давялося адваёўваць сваю каханую нават пры дапамозе гармат.

Ікона святой Сафіі Слуцкай.

Першая пастаноўка драмы Уладзіслава Сыракомлі "Магнаты і сірата. Соф'я, князёўна Слуцкая" адбылася на кракаўскай сцэне ў 1859-м, і толькі цяпер, у перакладзе на беларускую мову, ажыццёўлена яе ўвасабленне і ў нашай краіне. Да 420-годдзя з дня нараджэння славутай князёўны, абаронцы праваслаўя на нашых землях, на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё ў праекце "Тэатр Беларускага радыё" адбылася прэм'ера радыёспектакля ў дзвюх частках па аднайменнай гістарычнай драме аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры.

Па словах рэжысёра пастаноўкі Алега Вінярскага, твор Уладзіслава Сыракомлі прысвечаны рэальным падзеям беларускай гісторыі і мае выразнае патрыятычнае гучанне. Сама дзея ў спектаклі адбываецца ў 1600 годзе ў Вільні.

У творчую групу радыёпастаноўкі ўвайшлі перакладчык Ірына Багдановіч, гукарэжысёр Валерый Бяляеў і рэдактар Галіна Шаблінская. Ролі выконваюць народны артыст СССР, народны артыст Беларусі Генадзь Аўсяннікаў, народны артыст Беларусі Арнольд Памазан, заслужаныя артысты нашай краіны Уладзімір Рагаўцоў, Георгій Маляўскі, Тамара Нікалаева, Леанід Улашчанка, Андрэй Душачкін, артысты Сяргей Кавальскі, Віталь Краўчанка, Андрэй Кавальчук, Валерый Шушкевіч, Аляксандр Кашпераў, Андрэй Захарэвіч і Аляксей Чарнігін. У галоўных ролях — Кацярына Яворская і Аляксандр Гарцуеў.

Хруцкі? Падобна на тое!

Супрацоўнікі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка выказалі версію, што партрэт Адама Міцкевіча, які знаходзіцца ў фондах мясцовай мастацкай галерэі, належыць пэндзлю... Івана Хруцкага. Сітуацыю для "К" патлумачыла загадчык мастацкай галерэі музея-запаведніка Ларыса Лысенка.

Справа ў тым, што праўнучка Хруцкага Ядвіга Мацееўская (таксама мастачка), жывучы ў Кіеве, неаднойчы наведвала Полацк, цікавілася лёсам і творчасцю прадзеда, які жыў і тварыў у маёнтку Захарнічы (Полацкі раён). А пасля смерці завяшчала свае работы перадаць Полацкаму музею-запаведніку. У 1998 годзе 720 палотнаў Ядвігі Мацееўскай былі перададзены з Украіны на Беларусь...

Рыхтуючыся да персанальнай выстаўкі праўнучкі мастака, адбіраючы шэраг палотнаў для Нацыянальнага мастацкага музея, каб прадставіць іх пад час святкавання 200-годдзя Івана Хруцкага побач з работамі славутага продка Мацееўскай, Ларыса Лысенка натрапіла на партрэт Адама Міцкевіча. Па манеры пісьма, стылі і настроі праца істотна адрознівалася ад твораў Мацееўскай. Далей — болей. У кнізе пра Хруцкага Ларыса Лысенка ўбачыла варыянтны партрэт Міцкевіча (пэндзля Хруцкага), які захоўваецца ў Пецярбургу — у Музеі рускай літаратуры. Камп'ютэрнае накладанне пацвердзіла ідэнтычнасць памераў абедзвюх выяў.

У сярэдзіне красавіка Нацыянальная акадэмія навук Беларусі правяла лазерную матэрыялазнаўчую экспертызу полацкай загадкі. Вынік наступны: дата стварэння партрэта — 1850-я гады. Напісаць партрэт Адама Міцкевіча Ядвіга Мацееўская не магла, бо нарадзілася ў 1916-м. Палатно належыць пэндзлю Івана Хруцкага? Мастакі, як вядома, рабілі паўторы сваіх карцін... Ларыса Лысенка не спяшаецца з высновамі, але вельмі спадзяецца на пацвярджэнне сваёй версіі, бо карцін Хруцкага ў фондах мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка пакуль няма.

Неўзабаве чакаецца шэраг дадатковых экспертыз полацкай загадкі, што правядуць спецыялісты Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Менавіта яны пацвердзяць або абвергнуць здагадку.

І яшчэ адна цікавостка: па словах Ларысы Лысенка, на зваротным баку партрэта Міцкевіча знаходзіцца... нацюрморт. Абодва адлюстраванні — недапрацаваныя, незавершаныя. Каравей, палатно літаральна з усіх бакоў — спрэс загадкавае. Якімі будуць адгадкі?



Я.Р.

На здымках: дзве работы, знойдзеныя ў сховішчах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Слуцк і Пекін Кандрата Карсаліна

Сёння я распавяду яшчэ пра аднаго таленавітага мастака з Беларусі. Імя яго амаль што невядомае не толькі на ягонай радзіме, але і ў Расіі, дзе ён пражыў большую частку свайго жыцця. Гаворка — пра Кандрата Ільіча Карсаліна, чалавека незвычайнага лёсу, які прайшоў складаны шлях ад іканапісца-самавука да акадэміка жывапісу і тытулярнага саветніка. Аднак падрабязна прасачыць яго жыццёвую і творчую біяграфію немагчыма, бо захавалася няшмат не толькі архіўных дакументаў, але і яго твораў. І ўсё ж паспрабую сёе-тое аднавіць з таго, што ўдалося адшукаць.

Слуцк, або Што параіў прафесар?

Дык вось, Кандрат Карсалін нарадзіўся 9 сакавіка 1809 года ў Слуцку ў мяшчанскай сям'і. Ён рана захапіўся маляваннем і ўжо ў 12-гадовым узросце самавукам пачаў пісаць іконы. А праз два гады стаў памочнікам слуцкага іканапісца. У развіцці яго мастацкага таленту дапамагла яму, як ён сам прызнаваўся пазней, "капіроўка з больш мастацкіх твораў і ўласны густ". Хлопчыка заўважыў настаўнік малявання і жывапісу мясцовай гімназіі Томаш Гес. Гэты высаказдольны чалавек быў выхаванцам Віленскай мастацкай школы, вучнем Я.Рустэма. І менавіта пад яго кіраўніцтвам малады Кандрат робіць першыя прафесійныя крокі ў засваенні жанраў карціны і партрэта. Пазней Карсалін у адказах на апытальнік Акадэміі мастацтваў пісаў: "Па партрэтным жывапісе я карыстаўся некаторымі парадамі настаўніка малявання і чыстапісання пры Слуцкай гімназіі — мастака Геса" (Цэнтральны гістарычны архіў у Пецярбургу, ф. Імператарскай Акадэміі мастацтваў, оп. 14, д. 72-К, л. 21).

Цяжка сказаць, колькі доўжыліся іхнія творчыя стасункі ў Слуцку, бо далейшыя сляды знаходжання Карсаліна выяўляюцца… у горадзе Арле. Вядома, што на арлоўскай выстаўцы 1835 года ён прадставіў некалькі партрэтаў, у тым ліку генерал-маёра Прытвіца і ягонай жонкі, графіні Зотавай, генерал-маёра Карпава і афіцэраў Елізаветградскага гусарскага палка. Праз два гады, праязджаючы Арол, гэтыя партрэты пабачыў канферэнц-сакратар Акадэміі мастацтваў, прафесар Васіль Іванавіч Грыгаровіч. Адразу ж адшукаў аўтара і настойліва параіў яму неадкладна кідаць заняпалы Арол і ехаць у Пецярбург для ўдасканалення майстэрства. І Карсалін зрабіў так, як параіў прафесар.

Пецярбург, або "Цытата" Карсаліна

Новую старонку свайго жыцця пачаў з наведвання рысавальнага класа Акадэміі. Хто былі ягоныя педагогі і з кім ён вучыўся — дакладна невядома. Але, праглядаючы спіс выкладчыкаў і студэнтаў Акадэміі канца 30-х гадоў XIX ст., магу меркаваць, што Карсалін мог вучыцца ў Івана Аляксеевіча Іванова, Аляксея Ягоравіча Ягорава, або Сцяпана Піліпавіча Галакціёнава. Сярод ягоных аднакурснікаў маглі быць Фама Адаміні, Дзмітрый Савельеў, Рыгор Бялоў, Сяргей Антонаў, Канстанцін Куневіч, Раман Клюквін, Канстанцін Афанасьеў, Іван Рэймерс, Мікалай Рамазанаў (стваральнік пасмяротнага скульптурнага партрэта Гогаля, гарэльефаў для манферанаўскага помніка Мікалаю I у Пецярбургу, бюстаў А.Пушкіна, І.Крылова, І.Панаева). Большасць імёнаў аднакурснікаў Карсаліна ўвогуле сёння мала вядомыя (акрамя, канешне, скульптара Рамазанава), але на акадэмічнай выстаўцы 1836 года Кандрат мог сустрэцца і са студэнтам-старшакурснікам Акадэміі Іванам Айвазоўскім, і з самім Аляксандрам Пушкіным, які быў вельмі прыкметны на гэтым вернісажы.

Поспехі ў мастацтвах у Карсаліна былі настолькі відавочныя, што Вучоны савет восенню 1838 года палічыў сваім абавязкам хадайнічаць перад імператарам Мікалаем I аб дапамозе Карсаліну. Справа ў тым, што творца прадставіў Акадэміі мініяцюрны партрэт расійскага цара, "в коем чистота красок, нежность кисти и вообще отделка необыкновенная". Вядома, што ў гэты час Карсалін многія свае партрэты "в малом виде" маляваў з натуры, вельмі добра перадаючы падабенства твараў і іхнюю вобразную выразнасць. А тут, відаць, скарыстаў замест "натуры" партрэт Мікалая I пэндзля моднага тады ў Пецярбургу нямецкага жывапісца Франца Кругера, які апошні намаляваў у 1836 годзе. Дарэчы, парадных партрэтаў гэтага мастака ў Эрмітажы шмат. Мабыць, "цытаванне" Кругера і з'явілася прычынай таго, што хадайніцтва Вучонага савета не дасягнула мэты: карсалінскі партрэт, які быў пададзены імператару, не атрымаў ніякай падтрымкі і ўзнагароды.

Акрамя ўласна партрэтаў, Карсалін працаваў і ў іншых жанрах. Так, вядомая яго акварэль 1838 года, у якой паказана народная бытавая сцэна: на беразе Балтыйскага мора ў Стрэльні хлопцы і дзяўчаты ў святочных строях гуляюць у гарэлкі. Цудоўна валодаючы малюнкам і ўменнем кампанаваць групы, Карсалін з вялікай жывасцю змог перадаць у гэтай сцэне натуральнасць рухаў і жэстаў, дынаміку гульні.

Пекін, або Навошта місіі мастак?

1839-ы стаўся для Карсаліна годам важных падзей і сур'ёзных змен у жыцці. 5 жніўня за "Аўтапартрэт" і "Мужчынскі партрэт" Савет Акадэміі прысвоіў яму званне свабоднага пазакласнага мастака партрэтнага жывапісу, а праз 10 дзён яго залічылі кандыдатам на пасаду мастака Расійскай духоўнай місіі ў Пекіне. І тут трэба расказаць чытачам пра тое, што ўяўляла з сябе гэтая місія і як, з якой мэтай яна з'явілася.

Яшчэ ў 1728 годзе Расія і Кітай заключылі між сабой так званы Кяхцінскі трактат, па якім Расія займела права ўтрымліваць у Пекіне пастаянную духоўную місію. Яе персанал, паводле гэтага пагаднення, мусіў абнаўляцца кожныя дзесяць гадоў. У функцыі місіі ўваходзіла абарона гандлёвых, эканамічных і культурных інтарэсаў Расійскай імперыі. І аж да сярэдзіны XIX ст. гэтая місія была адзіным афіцыйным прадстаўніцтвам замежнай дзяржавы ў Кітаі: яна ў Паднябеснай прадстаўляла не толькі Праваслаўную Царкву, але і ўсю Расію, адыграўшы значную ролю ў справе станаўлення расійска-кітайскіх стасункаў. Аднак да гэтага часу расійская гістарыяграфія не мае абагульненай навуковай працы па гісторыі праваслаўнай місіі ў Кітаі, якая б асэнсавала ўсе бакі яе дзейнасці...

У склад кожнай, штораз наноў фарміраванай, місіі Акадэміяй навук уводзіліся навукоўцы — для вывучэння вялізных, часта зусім не даследаваных, тэрыторый, выдатныя спецыялісты ў галіне кітайскай мовы, а таксама мастакі, чые жывапісныя, графічныя і акварэльныя творы цудоўна дапоўнілі апісанні вучоных. У сакавіку 1825 года Міністэрства замежных спраў звярнулася да Акадэміі мастацтваў з прапановай сумесна падрыхтаваць аднаго або двух выхаванцаў Акадэміі для паездкі ў Кітай у складзе чарговай — адзінаццатай па ліку — місіі. Цягам пяці гадоў кандыдатам патрэбна было атрымліваць грунтоўныя веды ў розных навуках і пачатковыя настаўленні ў кітайскай мове, "знание коей поведет их к необходимым исследованиям о китайской живописи, о составлении красок, столь превосходных по яркости и прочности своей". Асаблівую ўвагу трэба было скіраваць на ўменне маляваць партрэты і пейзажы з натуры, бо ў час свайго знаходжання ў Пекіне "они встретят более случаев заниматься сими родами искусства, и, что важнее, успехами в оных могут принести истинную пользу и славу своему отечеству".

Першым мастаком, які выказаў жаданне паехаць у Кітай, быў выпускнік Акадэміі, пензенец Антон Легашоў. У складзе 11-й місіі ён і яшчэ 12 чалавек прыехалі ў Пекін вясной 1830 года. Толькі за пяць наступных гадоў Легашоў намаляваў каля 40 пагрудных партрэтаў найбольш знакамітых грамадзян Кітая, дзесяткі карцін і пейзажаў (некалькі твораў знаходзяцца ў Рускім музеі ў Пецярбургу) і шэраг ікон для Успенскай царквы ў Пекіне.

І вось прыспеў час Карсаліна. У 1840 годзе ён змяніў Легашова і прыбыў у Пекін у складзе 12-й місіі на чале з архімандрытам Палікарпам (Тугарынавым). З Карсаліным былі маладыя вучоныя І.Захараў, А.Чашкевіч, урач А.Татарынаў, прыстаў М.Любімаў і магістр Казанскага універсітэта В.Васільеў. Захаваліся нататкі Васільева, будучага выдатнага вучонага-сінолага, што распавядаюць пра тое, наколькі спакуслівая была паездка ў Пекін для яго і ягоных таварышаў, у тым ліку і для Карсаліна: "…Итак, мы внутри китайского города, да еще столичного! Видеть обыкновенные китайские города нетрудно: в них приезжают и киргиз с границ омской линии; наши кяхтинские купцы живут всего в двух шагах от китайского города; русские, плывущие по Амуру, также заезжают в китайский город Сахалиянь-улу; европейцы давно уже познакомились с приморскими городами. Но побывать в столице Китая… составляло прежде предмет зависти. Как досадовали европейцы на то, что мы, русские, одни бываем в Пекине!.."

Іркуцк, або Партрэты і мініяцюры

Аднак жа жыццё ў місіі працякала ў шматлікіх інтрыгах, сварках, даносах начальству адно на аднаго. Ахвярай паклёпаў накавана было стаць Карсаліну, якога прымусілі раней тэрміну пакінуць Пекін. Што на самой справе здарылася — невядома. Афіцыйная матывацыя: яго ад'езд быў звязаны "с болезнью, приключившеюся от вредного влияния тамошнего климата". Такім чынам, Карсалін прабыў у Кітаі не больш за тры гады, хоць яшчэ да 21 жніўня 1846-га працягваў знаходзіцца ў распараджэнні Азіяцкага дэпартамента. Гады да вяртання ў Пецярбург ён правёў у горадзе Іркуцку (што ён там рабіў — таксама невядома).

З ліку твораў мастака, прысвечаных Кітаю, вядомая толькі адна карціна: "Від на загарадны палац пад Пекінам" (я яе бачыў у Рускім музеі). Яна была створана прыкладна ў 1859 — 1860 гадах, і потым двойчы экспанавалася на выстаўках у Акадэміі мастацтваў. Малявалася карціна па натурных замалёўках, якія Карсалін прывёз з Кітая. На палатне адлюстраваны пейзаж: лугі, горныя пашы, палі з зеленаватымі пасевамі рысу, пералескі, яры, дарогі, па якіх павольна рухаюцца запрэжаная конямі павозка, кітаянка ў белым адзенні на ішаку, побач — ідзе мужчына. А далей, у перспектыве, на схіле гары, за дрэвамі, пасвяцца коні. А яшчэ далей вымалёўваецца вычварных абрысаў палац імператарскай летняй рэзідэнцыі Багдыхана Ван Шэу-шана. Ля гарызонту, у глыбіні празрыстых далячынь, сінее панарама Пекіна. Прафесіяналізм, дакладнасць малюнка, вытанчаная лёгкасць перспектывы, чысціня і гармонія фарбаў ствараюць хвалюючую карціну прыроды, выяўляюць тонкі і паэтычны вобраз далёкай краіны.

Больш нічога з "кітайскай" спадчыны мастака да нас не дайшло, хоць ёсць сведчанне самога Карсаліна, што ў прыстава Любімава знаходзіліся яго малюнкі "мясцовых відаў і тыпаў", зробленыя ў час транзіту праз Манголію. Дзе яны цяпер, гэтыя малюнкі, невядома, як не вядомы лёс і яшчэ аднаго вялікага панарамнага палатна — "Від горада Пекіна".

А вось карсалінская серыя мініяцюрных партрэтаў сярэдзіны 1840-х гадоў захавалася. У ёй прадстаўлена больш за 20 тытулаваных чыноўнікаў сенацкай рэвізіі, якая была накіравана ў 1842-м для расследавання абуральных злоўжыванняў генерал-губернатара Усходняй Сібіры Руперта. Карсалін маляваў партрэты не на звычайных для мініяцюрнага жывапісу пласцінках слановай косці, а на паперы і не дадаваў да акварэлі гуаш. Ён смела адышоў ад традыцыйных прыёмаў партрэтнай мініяцюры, якая патрабавала поўнай і акуратнай завершанасці ўсёй паверхні асновы. Партрэты ж Карсаліна напісаны шырока, жвава і выразна, фігуры разнастайныя ў паваротах і маштабных суадносінах з памерамі мініяцюры. Відаць, тады ж мастак намаляваў вялікі, з фігурамі ў поўны рост, групавы партрэт членаў гэтай сенацкай рэвізіі, які лічыў сваёй лепшай работай.

Зноў Пецярбург, або Нумар "1990"

А як жыў Карсалін пасля вяртання ў Пецярбург? З-за таго, што ён раней тэрміну выйшаў са складу Пекінскай місіі, пенсіі яго пазбавілі. Праўда, у 1854 годзе за партрэт обер-свяшчэнніка арміі і флоту Кутневіча яму было прысвоена званне акадэміка партрэтнага жывапісу, але гэта мала што змяніла ў яго жыцці. Перабіваўся на выпадковых уроках і заказах, сярод чаго пераважалі заказы на царкоўныя абразы.

У 1866 годзе ён стварыў цудоўную ікону Нараджэння Хрыста і ікону Уваскрэсення Хрыста, якія ўпрыгожылі царкву рускага консульства ў японскім горадзе Хакадаце. Вядомыя і іншыя яго іконы: трох святцеляў і Рыгора Дваяслова для Варшаўскага сабора. Але хутка з-за хваробы на вочы мастак працаваць не змог і павінен быў звярнуцца па дапамогу ў Акадэмію мастацтваў. Па хадайніцтве Г.Гагарына і акадэміка Ф.Бруні яму была выдаткавана пенсія з Дзяржаўнага казначэйства ў памеры 16 рублёў 60 капеек. А 3 ліпеня 1872 года акадэміку і тытулярнаму саветніку К.Карсаліну Акадэмія мастацтва выдала сведчанне аб службе за нумарам 1990. Гэтая дата ў рускім і беларускім мастацтвазнаўстве, дзе згадваецца імя мастака, лічыцца годам яго смерці. Існуюць звесткі, што памёр ён у Пецярбургу. Магчыма, і так.

* * *

Але выкладчык гісторыі выяўленчага мастацтва Слуцкай дзіцячай мастацкай школы Ігар Ціткоўскі гадоў 15 таму даказаў, што гэта не зусім дакладна. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь ён знайшоў некалькі дакументаў, якія абвяргаюць афіцыйна прызнаную дату смерці Карсаліна. Адзін з дакументаў згадвае імя Карсаліна як жыхара Слуцка ў справе выключэння яго з падатковага становішча. Іншы дакумент — ад 1882 года — дазваляе вызначыць "вольности", якімі карыстаўся мастак, што ўвянчаны высокімі званнямі. Карсалін стаіць пад № 31 у "Списке гражданских и военных чиновников, состоящих в отставке, без учреждения над ними полицейского надзора, проживающих в Слуцком уезде". Тут мастак падаецца як дамаўласнік. Трэці дакумент, магчыма, дазваляе ўдакладніць дату ягонай смерці. Хаця і гэта не факт. Дакумент звязаны з выключэннем мастака са спіса пенсіянераў грамадзянскага ведамства, хоць пра ягоную смерць у ім нічога не сказана. Удакладняецца, што тытулярны саветнік, акадэмік Імператарскай Акадэміі мастацтваў Кандрат Карсалін з 1879 па 1883 год уключна атрымліваў пенсію: 196 рублёў штогод — па 16 рублёў 33 капейкі ў месяц.

Паўстае пытанне: дзе ён пражываў і чым займаўся з 1872 па 1879 гады? Адказу няма. Але, зыходзячы з архіўных дакументаў, адна акалічнасць — бясспрэчная: пасля 1879 года і да 1883-га ён знаходзіўся на радзіме, у Слуцку. Магчыма, незадоўга да смерці мастак з якіх-небудзь прычын вярнуўся ў Пецярбург? На такую думку мяне падштурхнуў той факт, што знаходжанне магілы Карсаліна таксама невядомае. Калі б такі шырока вядомы чалавек, як Карсалін, памёр у правінцыйным маленькім Слуцку, дык, думаю, смерць ягоная не была б пакінута па-за ўвагай, і ён быў бы пахаваны з вялікімі ўшанаваннямі. Прынамсі, месца яго пахавання так хутка не знікла б з поля грамадскага зроку. Ды і ў мясцовых газетах былі б апублікаваны адпаведныя некралогі. Але такіх у архівах і ў старых газетных падшыўках пакуль не знойдзена.

Барыс КРЭПАК

На здымках: члены Духоўнай місіі Расіі ў Пекіне (адзін з іх, як сведчаць дакументальныя крыніцы, — Карсалін); К.Карсалін. "Від на загарадны палац пад Пекінам".

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні родным, блізкім і сябрам заслужанага дзеяча культуры Беларусі, вядомага журналіста Тамары Аляксееўны АБАКУМОЎСКАЙ з прычыны яе смерці.

АК Афіша "К"

з 15 мая — да 22 мая

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:

- **3 15 — "Мая Францыя"** Ілоны Касабука (жывапіс).
- **"Слуцкія паясы".**
- **"Вялікай Перамозе 65 гадоў"** (жывапіс, графіка, скульптура).
- **"Святыя заступнікі ў праваслаўнай іканапісі XVI — XIX стст.".**
- **"Марк Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда".**
- **"Нармандыя ў жывапісе".**

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Евангельскія і біблейскія сюжэты ў італьянскай гравюры XVIII ст.".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

- Выстаўка **"Незвычайнае ў звычайным"** Г.Малочнікава.
- **"Ваўкавыск стары і новы".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Свет дзяцінства. Рускі жывапіс XIX — пачатку XX стст.".**

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:

- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**

Выстаўкі:

- **"Прылады пакарання Сярэднявечча" ("Петрапаўлаўская крэпасць", Санкт-Пецярбург).**
- **"Водбліскі ваеннай славы" (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).**

Дом-музей I З'езда РСДРП г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

- Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I З'езда РСДРП".**
- Выстаўка **"Вузельчыкі на памяць".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

- Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўкі:

- **"Зямля мая мяне заве"** (да 65-годдзя Перамогі).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
- Выстаўка мастацкіх работ з прыватнай калекцыі А.Радаева і з фонду Музея Я.Купалы **"Віленскія вобразы".**
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў **"Дзядзька Янка, добры дзень!".**

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:

- **"Святло стагоддзяў".**
- **"Асабістая справа".**
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**
- **"Спадарожнікі дзяцінства".**
- **"Дарогамі жыцця".**
- **"Беларускія пісьменнікі XX стагоддзя ў творах выяўленчага мастацтве".**

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

- **"Халодная зброя. Традыцыі і сучаснасць".**
- **"Нашчадкі Вялікай Перамогі..."**
- **"Как молоды мы были... Семейный альбом"** (выстаўка юных мастакоў Беларусі і Расіі).

Выстаўкі праекта "У пошуках страчанага" У.Ліхадзедава:

- **"Беларусь. Рэха вайны ў памяці пакаленняў".**
- **"Беларусь на старых паштоўках канца XIX — пачатку XX стст.".**
- **"Мінск: падарожжа ў часе".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:

- **"Як Фенікс з попелу і руін..."** (фотадакументальная выстаўка).
- **"Сучасны маскоўскі габелен".**
- Выстаўка І.Айвазоўскага і мастакоў-марыністаў XIX ст. **"Хваляў шалёных прыбоем".**

Экспазіцыі:

- **"Культавыя прадметы".**
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (*грот палаца*).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- "Чырвоная гасцёўня".
- "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея.

Вежа палаца

Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя "Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:

- **"Па гарадах і краінах".**
- **"Святыя мясціны зямлі рускай"** (культавыя прадметы і работы Андрэя Панкаўца).

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:

- **"Вобраз сучасніцы"** (фотаработы Уладзіміра Фаяўцова) .
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
- Працуе куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Ваенна-гістарычная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Гомельшчыны.
- Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.

Выстаўкі:

- **"Айчынная вайна 1812 года".**
- **"Музей крыміналістыкі".**
- Ваенная тэхніка на адкрытай пляцоўцы.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- **"Фарбы пераможнай вясны"** (да 65-годдзя Перамогі).

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

- **"Энергія колеру"** (работы рэабілітацыйнай студыі "Палітра").
- Польска-беларуская выстаўка работ Кшыштафа Рапсы і Аляксея Богустава (жывапіс і графіка).

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

- Выстаўка работ беларускіх мастакоў.
- Выстаўка жывапісу Ірыны Міклашэвіч **"Прыгажосць маёй зямлі".**

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8-0232) 77 75 20.

Выстаўкі:

- **"Свет архідэй".**
- **"Кветкі Расіі на вашых плячах"** (шалі і хусткі з г. Паўлаўскі Пасад)
- **"Жылі-былі"** (сучасная кніжная ілюстрацыя).
- Выстаўка жывапісу, графікі і скульптуры з фондаў Музея сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск).
- Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

УВАГА!

Паважаныя чытачы!

ІДЗЕ ПАДПІСКА

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 74958,
ведамасная падпіска — 749582.



НА ЧЭРВЕНЬ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2010 ГОДА!

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

- **16 — "Прызванне — опера!"** (юбілейны вечар Віктара Чарнабаева).
- **17 — "Набука"** Дж.Вердзі.
- **19 — "Рыгалета"** Дж.Вердзі.
- **21 —** Балеты ў адной дзеі: **"Шапэніяна"** (на музыку Ф.Шапена) **"Пахіта"** Л.Мінкуса. **"Балеро"** М.Равеля.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

- **15 — "Мужчына на мяжы нервовага зрыву"** Н.Мюлюаха.
- **15 — "Гісторыя двух сабак"** Я.Конева *(дзіцячы спектакль).*
- **17 — "Вандроўнікі ў Нью-Йорку"** А.Папова.
- **19 — "Неба ў дыяментах"** П.Адамчыкава.
- **20 — "Рытмы і рыфмы"** (паэтычна-акустычны канцэрт).
- **22 — "Квакі і квокі"** Я.Лёгкіна *(дзіцячы спектакль).*

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **16 — "Хлопчык Зорка"** А.Уайльда.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637
Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя: Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0494414 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77.
Тэл. (017) 289-34-66.
Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

© "Культура", 2010.

Індэкс 63875
Наклад 8683
Падпісана ў свет 13.05.2010 у 18.30
Замова 2277
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780